Пролетарыі ўсіх краін, аб'ядноўвайцеся!
Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕТСКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ЧАЦЬВЕР
1 кастрычніка 1931 г.
№ 227 (3316)

У-б. «Савецка... окэ, Мэхов... бібліятэка Ін... УЛ. ОЬНЕ...
Бібліятэка Ін. Горкага Ін. 2782

УВЕСЬ СЬВЕТ ПРАЦОУНЫХ

гарыць агнём пратэсту супроць крывавых расправаў польскіх фашысцкіх турэмшчыкаў над палітзьняволенымі

Бурныя дэманстрацыі пратэсту ў Парыжы

ПАРЫЖ, 29-IX. Паводле паведамленьня „Юманітэ" у нядзелю 27 верасьня польскія і французкія рэвалюцыйныя рабочыя наладзілі перад будынкам польскага пасольства дэманстрацыю пратэсту супроць катаваньняў палітзьняволеных у Польшчы.

У пасольстве былі выбіты шыбы. 26 верасьня былі выбіты шыбы ў рэдакцыі выходзячай у Парыжы польскай газэты „Дзеньнік Польскі"

...Трашчыць па ўсім швам...



Гераічная барацьба палітзьняволеных у казэматах фашысцкай Польшчы з рэжымам катаваньняў працягваецца

ВАРШАВА, 28-IX. На працягу трох дзён, пачынаючы з 20 па 22 верасьня гэтага году, працягвалася дэманстрацыйная галадоўка палітзьняволеных ва ўсіх польскіх турмах. У многіх турмах галадоўка адбывалася на працягу 5 і больш дзён. Ня гледзячы на тое, што палітзьняволеныя былі ўжо зусім зьнясілены цэлым радам мясцовых галадовак і канфліктаў, з-за якіх загінулі шмат палітзьняволеных, усеагульная галадоўка пратэсту адзначалася выключнай салідарнасьцю і насіла масавы характар. У многіх мясцох напрыклад у Грудзендзу да галадоўкі далучыліся нават крымінальныя, ня гледзячы на тое, што новы рэглямант праводзіцца пад лёзунгам прыраўненьня палітычных да крымінальных і нават нібы для «палепшаньня» быту крымінальных зьняволеных.

Становішча ў польскіх турмах застаецца і пасьля галадоўкі вельмі напружаным. На палітзьняволеных сыплюцца ўсё новыя рэпрэсіі. Адначасова ня спыняюцца зьверскія зьбіваньні і катаваньні палітзьняволеных.

Тыповы ў гэтых адносінах весткі аб падзеях у турме Ленчыцы (Лёдзінскае ваяводзтва). Турэмная адміністрацыя перавяла некалькі дзясятнаў палітзьняволеных у самыя брудныя і вельмі цесныя памяшканьні, а ў адказ на пратэсты палітзьняволеных пазбавіла іх сяньнікоў, коўдраў і пасьцельнай бялізны і ліквідавала харчовую камуну. Калі палітзьняволеныя за пратэставалі супроць гэтага, адміністрацыя пусьціла на іх струмень вады з брандбояў.

Гэта паўтарылася два разы, а 9 гадзіне раніцы і каля поўдня. Калі палітзьняволеныя спрабавалі пратэставаць, турэмшчыкі разам з выкліканай паліцыяй сталі выцягваць палітзьняволеных па адным з камер, зьбівалі іх да страты прытомнасьці і потым кідалі «зачыншчыкаў» у халодныя, сырыя карцэры.

Японскі імпэрыялізм арганізоўвае калёніяльны ўрад у акупаванай Манчжурыі

ТОКІЁ, 30-IX. «Народная канфэрэнцыя» ў Мукдэне арганізавала «асоцыяцыю абгаварэньня мер, неабходных для ўрэгуляваньня становішча». Старшынёй абраны генэрал Гань-Чжао-Сі.

Асоцыяцыя апублікавала дэкларацыю, у якой гаворыцца, што яна «створана выключна для падтрыманьня парадку і ня будзе ўмешвацца ў ваенныя справы». Працягваюцца пошукі кандыдатаў у старшыні новага «незалежнага» ўраду. Поруч з Юань-Цзінь-Каем, Гань-Чжоў-Сі, Гань-Чжу-Ханем высоўваецца ў якасьці кандыдатаў—былы кітайскі імпэратар Ен-Сі-Шань і Сун-Чуан-Фан.

Паводле паведамленьня агенцтва Рэнго з Мукдэну, белагвардзейцы ў Мукдэне распрацоўваюць пляны стварэньня ўласнай дзяржавы, у прыватнасьці Манчжурыі. Яны хочуць «арганізаваць сумесна з іншымі расамі лёяльную, незалежную дзяржаву ў адной з часьцей Манчжурыі».

ТОКІЁ, 30-IX. Як паведамляе агенцтва Сімбун Рэнго, сьледам за абвяшчэньнем незалежнасьці Гірына, Хейлунцзян таксама абвясьціў незалежнасьць.

Паводле зьвестак з Харбіну, улада харбінскага асобнага раёну таксама абвясьціла незалежнасьць і назначыла 30 новых камітэтаў для кіраваньня рознымі часткамі раёнаў.

ТОКІЁ, 30-IX. Паводле вестак ваеннага міністэрства, генэрал Сі-Ся абвясьціў усіх начальнікаў паветаў Гірынскай правінцыі сваімі прыяцелямі і прыступіў да арганізацыі пяхотнага палка, кавалерыйскага батальёну, артылерыйскага атраду і жандармэрыі. Сі-Ся зьвярнуўся ўчора да японскай улады з просьбаю аб перадачы ім ваенных матар'ялаў, узятых пры разбраеньні гірынскай арміі.

Супроць „нацыянальнага" ураду—ураду надзвычайных дэкрэтаў голаду

Шматтысячныя дэманстрацыі пратэсту пралетарыяў і працоўных Лёндану

ЛЁНДАН, 28-IX. Учора ў Лёндане адбываліся дэманстрацыі рабочых, якія па сваіх разьмерах і па баявым настроі ўдзельнікаў перавышаюць усе выступленьні рабочых, якія былі з часу ўсеагульнай забастоўкі 1926 г.

Каля 7-мі тысяч рабочых з усходняй часткі Лёндану накіраваліся да яго цэнтру. Ля Оксфорд Стрыту да гэтых рабочых далучылася некалькі тысяч рабочых з заходняй часткі Лёндану. Дэманстранты накіраваліся ў Гайд Парк. Дэманстранты несьлі шмат лікія плякаты і сьцягі, маючы напераадзе аркэстры, якія выконвалі рэвалюцыйныя сьпевы.

У Гайд Парку вакол 6-ці трыбун, з якіх выступалі прамоўцы, сабралася ня менш 40 тыс. рабочых. У адназгодна прынятай рэзалюцыі рабочыя абяцалі актыўна падтрымліваць патрабаваньні рабочай хартыі і абараняць «Дэйлі Уоркер». Былі пасланы такса ма прывітаньні маракам Атлянтычнага флёту.

Пасьля прыняцьця рэзалюцыі, дэманстранты накіраваліся да турмы, у якой знаходзяцца рабочыя, арыштаваныя ў часе дэманстрацыі ў дзень адкрыцьця парляманту. Ля турмы таксама адбыўся мітынг, у якім прынялі ўдзел тысячы рабочых. Удзельнікі мітынгу гучна выкрыквалі прывітаньні па адрасу зьняволеных.

У Глазго таксама адбылася дэманстрацыя, у якой удзельнічала некалькі тысяч рабочых. Дэманстранты, ня гледзячы на забарону паліцыі, накіраваліся па вуліцах гораду к цэнтру. Дэманстрацыя ахоўвалася карпусамі рабочай абароны, узброеных кіямі і паліцыя не адважвалася напасьці на асноўную калёну дэманстрантаў. Паліцыя спрабавала многіх арыштаваць, але ў паліцэйскі вучастак ім удалося даставіць толькі 2-х рабочых.

У Вігаме (Лянкашырыя) камітэтам барацьбы за рабочую хартыю была арганізавана дэманстрацыя, у якой прынялі ўдзел 3 тыс. рабочых. На цэнтральным пляцы гораду адбыўся 10 тысячны мітынг, на якім была прынята рэзалюцыя, якая абяцае падтрымаць патрабаваньні рабочай хартыі. Гэткая—ж дэманстрацыя адбылася ў Брыстолі. У лагчыне трэцяй Ронды рабочыя аб'яднаюцца вакол камітэту дзеяньня, які нядаўна быў створаны для барацьбы з мерамі «нацыянальнага» ўраду.

ЛЁНДАН, 30. Тут адбылася магутная дэманстрацыя рабочых, якія дэманстравалі супроць мерапрыемстваў «эканоміі» нацыянальнага ўраду. Ка лёны рабочых з усіх раёнаў Лёндана прыбылі ў Гайд-Парк дзе была выбрана дэпутацыя, для таго, каб пайсьці у парлямант і ўручыць мэмарандум падпісаны 200-мі тысячамі рабочых, якія ўзялі на сябе абавязак усімі мерамі супраціўляцца супроць зьніжэньня дапамогі па беспрацоўі.

20 тысяч рабочых накіраваліся па вуліцы, якая вядзе да парлямянту. На чале дэманстрацыі ішлі калёны рабочых з бяднейшых кварталаў Лёндана ўзброеныя цяжкімі дубінкамі.

Пляц, на якім знаходзіцца парлямант ахоўваўся моцнымі атрадамі паліцыі. Аднак рабочым удалося ў шмат ліх месцах прарваць паліцэйскі кардон і прайсьці на пляц, дзе знаходзіўся парлямант. Прарваўшыхся на пляц рабочых атакавала конная паліцыя. Аднак рабочыя ня ўступілі і некалькі раз пераходзілі ў наступленьне дабіваючыся захопу пляцу.

Барацьба паміж паліцэйскімі і рабочымі працягвалася дзьве гадзіны. Ранена шмат рабочых, але шмат і паліцэйскіх. За гэты час дэпутацыі ўдалося прапікнуць у парлямант, дзе мэмарандум безпрацоўных прышлося прыняць. Калі дэпутацыя вышла з парлямента рабочыя перастроілі свае рады і накіраваліся стройнымі калёнамі ў Гайд-Парк, дзе дэманстрацыі працягваліся да 11 часоў вечара. Пасьля гэтага рабочыя разьбіліся на калёны і арганізавана разышліся па сваім раёнам пяючы рэвалюцыйныя песьні і ў такім-жа баявым настроі, як спачатку дэманстрацыі. Рабочыя настолькі арганізавана праводзілі дэманстрацыі, што паліцыі ўдалося арыштаваць толькі 9 рабочых.

Няхай жыве рэвалюцыйная барацьба палітзьняволеных польскага фашызму супроць рэжыму забойстваў!

Рэзалюцыя агульнага сходу замежных рабочых, спэцыялістаў і палітэмігрантаў Менску

10.000 палітзьняволеных польскіх турмаў змагаюцца не на жыцьцё, а на сьмерць з польскім фашызмам, супроць сыстэмы зьверскіх катаваньняў, супроць новага крывавага дэкрэту, супроць увядзеньня палявых судоў і вечнай катаргі для рэвалюцыянэраў, за вызваленьне ўсіх працоўных Польшчы з-пад ярма дыктатуры Пілсудзкага, дыктатуры голаду, тэрору і вайны.

10.000 палітзьняволеных Польшчы абвясьцілі агульную забастоўку. Лепшым барацьбітом—авангарду працоўных мас Польшчы—пагражае вялікая небясьпека—загінуць у гэтай няроўнай барацьбе з польскім фашызмам. Патрэбна хуткая і самаахвярная дапамога для абароны жыцьця палітзьняволеных Польшчы.

Мы, замежныя рабочыя, спэцыялісты і палітэмігранты далучаемся да голасу пратэсту мільённых працоўных мас Савецкай Беларусі, кляймім ганьбою польскіх катаў і заклікаем рабочых, сялян, спэцыялістаў і навуковых работнікаў усяго сьвету пратэставаць разам з намі.

Шлем гарачае прывітаньне ўсім зьняволеным братом і заяўляем, што мы, замежныя рабочыя і палітэмігранты, якія працуюць зараз на рыштаваньнях вялікай пяцігодкі, зробім усё магчымае, каб адкінуць рукі польскіх фашыстаў, якія імкнуцца фізічна зьнішчыць палітзьняволеных.

Няхай жыве і мацнее рэвалюцыйная барацьба палітзьняволеных Польшчы з фашысцкім рэжымам!

Няхай жыве і мацнее міжнародная пралетарская салідарнасьць у барацьбе палітзьняволеных Польшчы з фашысцкім рэжымам!

Няхай жыве і мацнее міжнародная пралетарская салідарнасьць у барацьбе з фашызмам!

Няхай жыве КПП—правадыр і арганізатар надыходзячай рэвалюцыі ў Польшчы!

Ад імя сходу: Рак-Міхайлоўскі (Заходняя Беларусь), Валуйскі, Казаводзкі (Канада), Г. Пэтш (Нямеччына), Р. Валас (Нью-Ёрк), Войціцкі, Каўцэвіч (Чэха-славакія), Грыншэль, Леванчук (Польшча), Сеўко, Ліпскі (Заходняя Беларусь), Баран, Васілевіч (Польшча), Фурке (Нямеччына), Мацейковіч (Вільня).

Партавыя рабочыя Данцыгу рыхтуюцца да забастоўкі

ВАРШАВА, 29-IX «Ілюстраваны КУр'ер Цодзённы» паведамляе, што ўлада Данцыгскага порту прыняла рашэньне зьнізіць зарплату партовых рабочых на 23 проц. і што ў адказ на гэта профсаюз партовых рабочых рашыў абвясьціць забастоўку, пачынаючы з першага кастрычніка.

Апроч таго, данцыгскі профсаюз распаўсюдзіў сярод партовых рабочых у польскім порце Гдыня адозву да мясцовых партовых рабочых і матросаў, заключаючы іх у падтрыманьне сваіх данцыгскіх таварышоў у іх барацьбе супроць зьніжэньня зарплаты.

Лёнамялкі-на поўны ход

Узяць прыклад з калгасаў „Чырвоны Востраў", „Новыя Русакі", „Ударнік" і „Беларусь", якія па-бальшавіцку справіліся з уборкай і апрацоўкай лёну

Скончыць першапачатковую апрацоўку лёну і канапель у тэрмін

Ліквідаваць разрыў

паміж уборкай і апрацоўкай лёну

Па Лёзьнянскім раёне ўборка, абмалот і расьціл лёну ў асноўным скончана. На 20 верасьня выцераблена 10.519 га, 99,4 проц., абмалочана і разаслана 97,6 проц.

Некаторыя сельсаветы не закончылі яшчэ абмалот і расьціл лёну. Крынкаўскі сельсавет выканаў плян на 86 проц.. Каралёўскі 86,2 проц. У гэтых сельсаветах апрацоўка лёну праходзіць надзвычайна марудна.

Побач з гэтым рад калгасаў пасьпяхова справіўся з апрацоўкай лёну. Так, калгас «Баявік», Унаўскага сельсавету, здаў ужо Лёзьнянскаму лёназаводу 4.389 кгр. трасты, «Інтэрнацыянал», Гарбаўскага сельсавету—17077 кгр. трасты і г. д. Усяго на 20 верасьня калгасамі раёну здана на лёназавод 32.960 кгр. трасты.

С. Водны.

Апрацоўка лёну зрываецца

Бабруйскі райкалгасаюз і райза паклаліся на самацёк

БАБРУЙСК. (БЕЛТА). Першапачатковая апрацоўка, абмалот, мочка і расьціл лёну па Бабруйскім раёне праходзіць надзвычайна марудна. Апошняя пяцідзёнка не дала ніякага зруху. На 20-е верасьня па калгасным сэктары абмалочана лёну—81,5 проц., разаслана—50,8 проц., замочана 33 проц. Калгасы «Качэрычы», Старцаўскага сельсавету, і «Чырвоны Баец» № 2, Туркаўскага сельсавету, яшчэ ня прыступілі да абмалоту лёну. Не абмалочаны лён гніе.

Райкалгасаюз і райза не забясьпечваюць цьвёрдага апэрацыйнага кіраўніцтва ў фарсаваньні хутчэйшага скончэньня абмалоту, мочкі і расьцілу лёну. Саюспаборніцтва і ўдарніцтва сярод калгаснікаў і паасобных калгасаў у апрацоўцы лёну не адчуваецца.

Партыйным і камсамольскім ячэйкам патрэбна шырока мабілізаваць калгасную грамадзкасьць на хутчэйшае скончэньне апрацоўкі лёну і здачы яго дзяржаве.

Здаюць лёнаволакно

Рад калгасаў Талачынскага раёну па сьпяхова спраўляюцца з апрацоўкай лёну. 20 верасьня калгас «Ударнік», Азерацкага сельсавету, здаў арганізаваным парадкам 3,5 цэнтн. лёнавалакна, калгас «Беларусь», Коханаўскага сельсавету здаў 3 цэнт. валакна.

Гэтых посьпехаў калгасы дабіліся дзякуючы правільнай арганізацыі працы ў калгасах, увядзеньню зьдзельшчыны.

Апрацоўка рэшта лёну працягваецца.

У. В.

Бальшавіцкія тэмпы работы

Калгас «Новыя Русакі», Гарадзішчанскага сельсавету, Шклоўскага раёну, значачасова скончыў уборку і абмалот лёну. У пачатку верасьня Шклоўскаму лёназаводу была перадана лёнасаломка з 21 га. 9 верасьня калгас прыступіў да апрацоўкі лёну. Да 18 верасьня калгас намяў 2 цэнт. лёнавалакна. Апрацоўка лёну працягваецца.

Калгас прыступіў да ўборкі канапель.

П. Гнезьдзялкоў.

Пераняць добры прыклад

Літоўскі нацыянальны калгас «Чырвоны трактарыст», Мсьціслаўскага раёну, добра справіўся з першапачатковай апрацоўкай лёну (30 га).

Работа была арганізавана па канвэеру. У выцераблена лёну адразу ачосваліся галоўкі, а саломку тут-жа сьцеляць. Такі спосаб мае дзьве выгады: па-першае, лён не пападае пад дождж ,па-другае, скарачаюцца да мінімуму тэрміны апрацоўкі. Як паказаў вопыт лён, які сушыцца на полі дае лепшае валакно, апроч таго, ачосаныя галоўкі даюць больш мякіны. Абчосаныя галоўкі лёну можна абмалаціць, калі здарыцца вольны час.

Семя на насеньне захоўваецца ў калгасе ў галоўках да самай вясны, дзякуючы чаму насеньне добра захоўваецца і дае добрыя ўсходы.

Свяцяніс.

Чырвоная дошка пераможнаў

Вярэдзе прыклад з калгасу „Чырвоны Востраў"

ЕЛЬСК. (Па тэлеграфе ад нашага карэспандэнта). Калгас «Чырвоны Востраў», Ельскага сельсавету, пасьпяхова справіўся з уборкай і апрацоўкай лёну. Гэтымі днямі калгас здаў дзяржаве 130 км. лёнавалакна.

Герасіменка.

Не марудзіць з апрацоўкай лёну

Полацак. (Ад нашага спэцкора). Ня правільная арганізацыя працы і нерацыянальнае скарыстаньне рабочай сілы ў калгасе «Кастрычнік», Гомельскага сельсавету, прывялі да прарыву на фронце лёнаўборкі. Гэты прарыў ліквідавалі ўсе іншыя калгасы сельсавету, якія ўзялі калгас «Кастрычнік» на грамадзкі буксір. Па ўборцы лёну ўзяла 13 брыгад, якія спаборнічалі паміж сабой. За адзін дзень лён быў выцераблены.

Але дрэнна абстаіць справа з абмалотам мочкай і сьцілкай лёну,а таксама з далейшай яго апрацоўкай.

Сяўба азіміны ў калгасе пастаўлена пад пагрозу зрыву. Усе тэрміны прайшлі, а плян сяўбы ня выкананы і на палову.

Я. Зорны.

Копыскаму лёназаводу апэрацыйнае кіраўніцтва

Будаўніцтва Копыскага лёназаводу закончана, ня гледзячы на тое, што ўсе тэрміны прайшлі. Пры сучасным тэмпах будаўніцтва ён ня будзе гатовы нават і праз год. На заводзе адказнага чалавека за будаўніцтвам. Ёсьць два кіраўнікі—загадчык будаўніцтвам т. Коцец і дырэктар завода Ажкоў, але абодвы нічога ня робяць ,каб пасунуць справу будаўніцтва лёназаводу.

Ня гледзячы на тое, што на заводзе яшчэ не закончаны мулярскія работы, рабочых муляроў чамусьці зьнялі з работы. Правядзеньне цесьлярскіх работ не забясьпечана патрэбнай рабочай сілай.

Месяц таму назад на будаўніцтва Копыскага лёназаводу быў пасланы працаўнік ад рэдакцыі «Савецкая Беларусь», тады работа адразу зрушылася з месца, але як толькі супрацоўнік рэдакцыі пакінуў завод, будаўніцтва зноў затармазілася.

Лёнаканапляводбуд і раённыя арганізацыі павінны павярнуцца тварам да будаўніцтва Копыскага лёназаводу. Неабходна зараз-жа зьнішчыць усе недахопы ,якія перашкаджаюць сваячасоваму пуску лёназаводу.

Рабкор.

Лёнакапляводбуд на кіруе будаўніцтвам

Ня гледзячы на тое, што тэрміны пуску Чырвонапольскага заводу ўжо прайшлі, да апошняга часу лёназавод яшчэ не гатоў. Пакуль што не атрыманы лёкамабіль, няма дэкарцекатара, трансмісіі, вэнтылятараў і іншага мантажнага абсталяваньня.

Рабочых па правядзеньні мантажу выкарыстоўваюць не па прызначэньні—у якасьці землякопаў, конюхаў і г. д. У выніку чаго высокакваліфікаваныя рабочыя мантажысты зьбіраюцца пакінуць работу.

Варта адзначыць ,што старшы мантажэр Ждановіч нядбайна адносіцца да сваіх абавязкаў і ня цікавіцца тым, як праводзяцца работы. На працягу месяца Ждановіч наведвае работу ня больш двух разоў, ня гледзячы на тое, што на 3-м будаўнічым вучастку неабходна кіраваць правядзеньнем мантажных работ. Ждановіч жыве ў Крычаве, дзе знаходзіцца яго сям'я і мала дбае аб мантажы лёназаводу.

Лёнаканапляводбуд павінен ужыць рашучыя захады, каб забясьпечыць у бліжэйшыя дні пуск Чырвонапольскага лёназаводу.

Мантажыст.

Прэміі лепшым

ГАРАДОК (Па тэл. ад наш. спэц. кар.). Для прэм'яваньня калгасаў за лепшую ўборку і апрацоўку лёну Белкалгасцэнтр адпусьціў раёну на 9.000 руб. гатовага адзеньня і іншых прамтавараў. Прэміі будуць выдаваць лепшым калгасам, якія ўдарна справіліся з уборкай і першапачатковай апрацоўкай лёну.

Палеес.

Калгас „Рулеўшчына" і камуна „Мір" вышлі пераможцамі

Сенно. У выніку добрай арганізацыі працы, увядзеньня зьдзельшчыны, добрага і сваячасовага ўліку працы, шырока разгорнутага саюспаборніцтва і ўдарніцтва, калгас Рулёўшчына пасьпяхова справіўся з сяўбой азімых, перавыканаўшы плян.

Засеяна 48,5 га жыта і 4,5 га пшаніцы, у той час калі паводле пляну патрэбна было засеяць толькі 43 га азімыны.

Камуна «Мір». Латыгальскага сельсавету, 15 верасьня таксама скончыла сяўбу, перавыканаўшы пляны.

А.

Перамога бальшавіцкіх тэмпаў

Да пуску домнаў першай чаргі і Харкаўскага трактарнага гіганту

Удар па малаверах і апартуністах

(Па тэлеграфе)

Бальшавіцкае прывітаньне рабочым і адміністрацыйна-тэхнічнаму пэрсаналу Магнітабуду ў дзень пуску домнаў першай чаргі дакладна ў тэрмін паводле дырэктыў партыі і ўраду.

Ваша гераічная работа і бальшавіцкія тэмпы будаўніцтва служаць лепшым прыкладам барацьбы за генэральную лінію партыі, за індустрыялізацыю краіны. Новыя домны, даючы мільёны тон мэталю, паскараючы ператварэньне нашай краіны ў краіну сталі—жалеза і машын—новы крок наперад для перамогі сацыялізму і моцны ўдар па ўсіх малаверах, апартуністах і ворагах рабочае клясы.

Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК кампартыі і яе правадыра тав. Сталіна, рабочая кляса упэўнена ідзе да перамогі і перамога.

Старшыня ЦВК БССР А. Чарвякоў.

Няхай жывуць будаўнікі-барацьбіты за трактаразавод

Харкаў, трактаразаводу

(Па тэлеграфе)

Ваша запрашэньне атрымаў, але, нажаль, ня маю магчымасьці прыняць асабісты ўдзел у ганаровым пуску трактарнага заводу. Вітаю будаўнікоў трактаразаводу з бліскучай перамогай на фронце індустрыялізацыі Савецкага Саюзу. Выказваю ўпэўненасьць, што будаўнікі трактаразаводу і на іншых франтох гаспадарчага разьвіцьця будуць актыўнымі ўдзельнікамі сацыялістычнага будаўніцтва, барацьбітамі за генэральную лінію партыі, за сацыялізм.

Няхай жывуць будаўнікі—барацьбіты за трактаразавод!

Няхай жыве камуністычная партыя—правадыр рабочае клясы!

Старшыня СНК Беларусі

Н. Галадзед.

Новы крок да перамогі сацыялізму

Харкаў, Трактарабуд

(Па тэлеграфе)

Ад імя рабочых, калгасьнікаў і ўсіх працоўных Беларусі прэзыдыум ЦВК Савецкай Беларусі шчыра вітае рабочых і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал Трактарабуду ў дзень пуску повага гіганта прамысловасьці. Ваша гераічная работа, бальшавіцкія тэмпы будаўніцтва забясьпечылі дакладнае выкананьне дырэктывы партыі і ўраду аб тэрмінах пуску Трактарабуду, служыць лепшым прыкладам барацьбы за генэральную лінію партыі, новым крокам наперад да перамогі сацыялізму і магутным ударам па ворагах дыктатуры пралетарыяту.

Трактары вашага заводу хутка загуцяць на калгасных палёх пагранічнай Беларусі і, паскараючы сацыялістычную рэканструкцыю сельскае гаспадаркі, будуць клікаць працоўных суседніх краін на шлях сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Старшыня ЦВК БССР А. Чарвякоў.

Аб разьвіцьці мясной і кансэрвовай прамысловасьці

Усім партыйным, савецкім, гаспадарчым і прафэсыянальным арганізацыям

Новыя абставіны сацыялістычнага будаўніцтва, новыя ўмовы працы, якія забясьпечваюць больш паскораны рост матар'яльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню рабочае клясы, высоўваюць зараз на адно з першых месц задачу карэннай рэканструкцыі ўсёй харчовай прамысловасьці і ў першую чаргу задачу стварэньня магутнай мясной, кансэрвавай індустрыі. На аснове посьпехаў сацыялізму хутка павялічваюцца патрэбы рабочае клясы ў прадуктах харчаваньня і тыя патрабаваньні, якія яна прад'яўляе да іх якасьці. Штогод у сацыялістычную прамысловасьць уцягваюцца мільёны новых рабочых. Хутка расьце насельніцтва гарадоў вакол шматлікіх індустрыяльных будоўляў, ломяцца старыя бытавыя ўмовы рабочай сям'і, у шырокіх маштабах расьце грамадзкае харчаваньне і яшчэ хутчэй патрэба ў ім. Для забясьпечаньня ў гэтых умовах снабжэньня працоўных прадуктамі харчаваньня і рашучага палепшаньня рабочага снабжэньня неадкладай неабходнасьцю зьяўляецца карэнная рэканструкцыя існуючых і будаўніцтва новых прадпрыемстваў мясной і кансэрвавай прамысловасьці на аснове найлепшага злучэньня высокай тэхнікі навейшых мясакамбінатаў і кансэрвавых заводаў з сацыялістычна арганізаваным вакол іх сельска-гаспадарчай сыравінай базай.

Цэнтральны камітэт і Савет народных камісараў адзначаюць рад посьпехаў за апошнія гады ў разьвіцьці прадпрыемстваў харчовай прамысловасьці, перапрацоўваючых мясную, рыбную і садовіна-гародную сыравіну. Пабудавана дзесяць новых мясакамбінатаў сярэдняга тыпу—у Омску, Вятцы, Краснадары, Армавіры, Палтаве, Воршы, Фрунзэ і г. д., з агульнай прапускной здольнасьцю да 175 тыс. тон гатовых мясных прадуктаў у адну зьмену; пабудавана 17 бойных фабрык—у Дарніцы, Марыупалі, Бійску, Крэменчугу, Есіпаве і інш., з агульнай прапускной здольнасьцю ў адну зьмену да 200 тыс. тон гатовых мясных прадуктаў; пабудаваны 41 новы кансэрвавы завод, з іх 24 рыбакансэрвавых, 14 садова-гародных, 3 мясакансэрвавых, з агульнай вытворчай магутнасьцю разам з рэканструяванымі кансэрвавымі заводамі да 1.200 мільёнаў 400-грамавых банак, у тым ліку 200 млн. мясных, 250 млн. рыбных і 750 млн. гародных і садовінных, супроць выпрацоўкі даваеннай кансэрвавай прамысловасьці ў 80 млн. банак.

Посьпехі гэтыя аднак зусім недастатковы з пункту гледжаньня тых задач, якія паўстаюць у сувязі са зьмяніўшайся абстаноўкай. Новапабудаваныя і рэканструяваныя прадпрыемствы мясной прамысловасьці ўладаюць нязначнай магутнасьцю, маюць сур'ёзныя тэхнічныя недахопы. У пераважнай большасьці гарадоў, у тым ліку і ў такіх буйнейшых цэнтрах, як Масква, Ленінград, Сталінград і інш., забясьпечэньне мясам грунтуецца на архіадсталых, пабудаваных дзесяткі год назад камунальных бойнях, не здавальняючых мінімальным тэхнічным і санітарным патрабаваньням (з 175 буйных старых боень толькі 26 маюць водапровад, пры большасьці боень няма раду перапрацоўваючых цэхаў—халадзільнага, утылізацыйнага, альбуміннага і інш.). Рад новых гарадоў—Магнітагорск, Беразьнікі і інш.—зусім ня мае мясаперапрацоўваючых прадпрыемстваў. Багацейшыя жывёлагадоўчыя раёны Ўсходу—Казакстан і Сібір—прымушаны з-за адсутнасьці мясакамбінатаў і крайняй трудносьці вывазу з далёкіх раёнаў жывой жывёлы ўтвараць забой у першабытных, так званых салганных бойнях, і то толькі ў зімовы пэрыяд. У рэзультаце—вялізарныя страты харчовых мясапрадуктаў, нізкая іх якасьць і недастатковае скарыстаньне каштоўных тэхнічных адыходаў мясной вытворчасьці.

У гэткіх-жа адсталых умовах старой прасольскай гаспадаркі праводзіцца перапрацоўка больш паловы здабываемай рыбы. Пры адсутнасьці дастатковай колькасьці халадзільнікаў і кансэрвавых заводаў на рыбных промыслах, пры адсутнасьці рэфрыжэратарнага флёту і крайняга недахвату ізатэрмічных вагонаў звыш 60 проц. рыбы ідзе ў засол, што значна пагаршае яе якасьць і павялічвае страты рыбных прадуктаў. У крайняя недастатковай ступені скарыстоўваюцца адыходы рыбнай прамысловасьці з прычыны адсутнасьці неабходнай колькасьці ўтылізацыйных установак, якія могуць даць такія каштоўныя прадукты, як рыб'і тлушчы і рыбакостная кармовая мука. Асноўнай задачай сёньняшняга дню зьяўляецца пераўтварэньне старога рыбнага промыслу ў тэхнічна ўзброеную рыбную прамысловасьць.

Кансэрвавая прамысловасьць перапрацоўвае самую вязначную частку садовіны і гародніны. Між тым без кансэрваваньня і іншых відаў перапрацоўкі, бяз шырокага разгортваньня халадзільнікаў і сушыльнай справы значныя гародныя і садовінныя багацьці акраін застануцца нескарыстанымі для палепшаньня забясьпячэньня прамысловых цэнтраў.

Нізкі тэхнічны ўзровень перапрацоўваючай прамысловасьці поруч з адставаньнем сыравіннай базы складае адну з галоўных прычын трудносьцяй у справе забясьпячэньня рабочых мясам, рыбнымі прадуктамі і садовіна-гародніной. Арганізацыя магутных жывёлагадоўчых саўгасаў, таварных жывёлагадоўчых фэрм у калгасах, разьвіцьцё аграмаджанай садовай і гародняй гаспадаркі, рэканструкцыя здабычы рыбы адкрываюць шырокія магчымасьці для нябывалага росту сыравіннай базы мясной і кансэрвавай індустрыі. Абапіраючыся на сацыялістычна арганізаваную сыравінную базу, мясная і кансэрвавая прамысловасьць маюць магчымасьць шырока скарыстаць усе заваёвы сучаснай тэхнікі для пабудовы новага тыпу мясных кансэрвавых прадпрыемстваў і тым самым поўнасьцю задаволіць узросшыя патрабаваньні рабочай клясы.

Падобна таму, як хлебная праблема не магла быць вырашана на аснове дробнай, тэхнічна адсталай сялянскай гаспадаркі, таксама-ж задача карэннага і рашучага палепшаньня забясьпячэньня працоўных мас ня можа быць вырашана на базе дробных, тэхнічна адсталых прадпрыемстваў харчовай прамысловасьці. Вось чаму хутчэйшае разгортваньне магутнай мясной і кансэрвавай прамысловасьці, якая абапіраецца на новыя дасягненьні сусьветнай тэхнікі, становіцца адным з важнейшых зьвеньняў сацыялістычнай рэканструкцыі нашай краіны і павінна прыцягнуць да сябе такую-ж увагу з боку рабочай клясы, прафсаюзаў, партыі і ўсіх савецкіх арганізацый, якая згрупавана зараз на буйнейшых будоўлях. У гэтым ключ для вырашэньня задачы карэннага палепшаньня рабочага забясьпячэньня, шлях узьняць прадукцыйнасьці працы, правільнай арганізацыі рабочай сілы і спыненьня яе цякучасьці. Недаацэнка задачы стварэньня новай буйнай харчовай індустрыі зьяўляецца такою-жа праяваю апартунізму, якою была недаацэнка ролі буйнай сельска-гаспадарчай вытворчасьці на базе саўгасаў і калгасаў у справе вырашэньня хлебнай праблемы.

Рабочая кляса нашай краіны мае ўсе ўмовы, каб і ў справе будаўніцтва харчовай прамысловасьці ня толькі дагнаць, але і ў карацейшы тэрмін апярэдзіць тэхнічны ўзровень перадавых капіталістычных краін.

II.

Выходзячы з гэтага, Цэнтральны камітэт і Савет народных камісараў пастанаўляе:

1. Адобрыць распрацаваны Наркамснабам СССР плян будаўніцтва на працягу 1931, 1932 і 1933 г .г. 57 новых мясапрамысловых камбінатаў з агульнай гадавой прапускной здольнасьцю ў адну зьмену да 1,5 млн. тон мясапрадуктаў.

У адпаведнасьці з гэтым плянам зацьвердзіць:

а) будаўніцтва 8 буйных мясакамбінатаў, з іх 3 у важнейшых рабочых цэнтрах — Маскве, Ленінградзе і Сьвярдлоўску і 5—у асноўных вываз ных раёнах мясной жывёлагадоўлі—Сяміпалацінску, Орску, Пакроўску, Самары і на Паўночным Каўказе, з агульнай гадавой прапускной здольнасьцю іх у адну зьмену ў 1.440 тыс. галоў буйнай рагатай жывёлы, 5. 440 тыс. сьвіней, 1.260 тыс. авец і з выпускам у адну зьмену 770 тыс. т. мясапрадуктаў, у тым ліку халоджанага і марожанага мяса—270 тыс. т., каўбасы і розных вэнджанасьцяй—280 тыс. т., харчовага сала—85 тыс. т. і 180 млн. 400-грамавых банак кансэрваў.

б) Будаўніцтва 14 мясакамбінатаў аднолькавага тыпу, з іх 9 у буйных рабочых цэнтрах—Дрэпрапятроўску, Запарожжы, Сталіна, Луганску, Ніжнім-Ноўгарадзе, Іванава-Вазьнясенску, Баку, Сталінградзе і ў раёне Кузбасу і 5 мясакамбінатаў у сыравінных раёнах—Верхнеудзінску, Краснаярску, Уфе, Магілеве і ў раёне Сыр-Дар'і, з агульнай гадавой прапускной здольнасьцю іх у адну зьмену 900 тыс. галоў буйнай рагатай жывёлы, 3 млн. сьвіней і 1.800 т. авец, з выпускам у адну зьмену 400 тыс. т. мясапрадуктаў, у тым ліку марожанага і халоджанага мяса—180 тыс. т., каўбасы і розных вэнджанасьцяй—160 тыс. т., сала— 50 тысяч тон і 37 млн. банак кансэрваў.

в) Будаўніцтва 35 дробных мясакамбінатаў паводле тыпавых праектаў, разьлічаных на абслугоўваньне патрэб такіх рабочых цэнтраў, як Іжэўск, Грозны, Бранск, Яраслаўль і інш., з агульнай прапускной здольнасьцю ў адну зьмену 1.100 тыс. галоў буйнай рагатай жывёлы, 3.200 тыс. сьвіней і 900 тыс. авец, з выпускам у адну зьмену 450 тыс. т. мясапрадуктаў, у тым ліку халоджанага і марожанага мяса—230 тыс. т., каўбасы і розных вэнджанасьцяй—170 тыс. т. і харчовага сала 50 тыс. тон.

2. Пачаць будаўніцтва Маскоўскага, Ленінградзкага, Сяміпалацінскага і Орскага камбінатаў, а таксама дзесяці дробных камбінатаў у 1931 г. са сканчэньнем іх не пазьней канца 1932 г.

Пачатак будаўніцтва рэшты мясакамбінатаў аднесьці да 1932 г. са сканчэннем іх будаўніцтва ў канцы 1933 г.

3. Для забясьпячэньня мясакамбінатаў устойлівай сыравіннай базай у адпаведнасьці з плянам будаўніцтва новай мясной індустрыі зацьвердзіць наступны заказ мясной прамысловасьці сельскай гаспадарцы на разгортваньне саўгасаў мясной жывёлагадоўлі ў раёнах цягаценьня мясакамбінатаў і на здачу імі жывёлы.

Назва мясакамбінату	Здача жывёлы „Скатаводам" у 1933 г.	Здача жывёлы „Сьвінаводам" у 1933 г.	Здача жывёлы „Аўцаводам" у 1933 г.	Здача жывёлы „Скатаводам" у 1935 г.	Здача жывёлы „Сьвінаводам" у 1935 г.	Здача жывёлы „Аўцаводам" у 1935 г.
	(у тысячах галоў)					
Маскоўскі	40	45	885	1480	—	—
Ленінградзкі	—	—	463	819	—	—
Сьвярдлоўскі	95	160	268	500	—	—
Сямілапалацінскі	160	200	75	180	434	725
Орскі	120	180	118	200	189	297
Пакроўскі	130	240	607	776	76	128
Самарскі	105	160	679	1142	204	312
Паўн.-Каўказкі	80	130	675	793	284	360
Дняпрапятроўскі	20	30	340	420	—	—
Запароскі	10	20	348	420	—	—
Сталінскі	15	21	170	210	—	—
Луганскі	15	25	170	210	—	—
Ніжагародзкі	—	—	178	501	—	—
Ів.-Вазьнясенскі	—	—	68	240	—	—
Бакінскі	15	30	—	—	38	61
Сталінградзкі	45	80	107	137	148	242
Верхнеудзінскі	30	80	70	150	203	369
Кр снаярскі	70	100	147	300	141	180
Уфімскі	40	60	156	234	152	260
Магілеўскі	—	—	320	840	—	—
Сыр-Дар'інскі	48	67	—	—	—	—
З.-Сіб. (у р-не Кузбасу)	25	40	75	175	—	—

4. Прапанаваць Наркамзему і Калгас цэнтру СССР сумесна з Наркамснабам СССР распрацаваць плян і неадкладна пачаць правядзеньне ўсіх неабходных мерапрыемстваў па адпаведным разгортваньні мясной таварнай жывёлагадоўлі, сьвінагадоўлі і гадоўлі авец у калгасах раёнаў цягаценьня мясакамбінатаў, а таксама выпрацаваць стандарт пастаўленай саўгасамі і таварнымі жывёлагадоўчымі фэрмамі калгасаў мясной жывёлы ў адносінах якасьці, вагі і хуткаспеласьці з тым, каб да 1935 году поўнасьцю ажыцьцявіць устаноўлены стандарт ва ўсіх саўгасах і ня менш як у палове калгасных таварных фэрм емясной жывёлагадоўлі.

5. Наркамснабу прадугледзець будаўніцтва ў 1932 г. у раёнах, дзе будуюцца новыя мясакамбінаты сеткі жывёлапрагонных баз на шляху сьледжаньня жывёлы да мясакамбінатаў, а таксама арганізацыю адкорму жывёлы на кармовых адыходах харчовай прамысловасьці ў адпаведнасьці з плянам разьвіцьця харчовай індустрыі, выходзячы з неабходнасьці давесьці адкормачныя валовень да 1,5 млн. галоў буйнай рагатай жывёлы і ў сувязі з гэтым будаўніцтва у 1932 г. адкормачных валовень да 200 тысяч валамесі.

6. Прадугледзіць у кантрольных ліч бах 1932 г. неабходныя асыгнаваньні і матар'яльнае забясьпячэньне будаўніцтва мясных камбінатаў абсталяваньнем і будматар'ялам.

III.

7. Адобрыць прынятую Наркамснабам СССР праграму будаўніцтва на працягу 1931, 32 і 33 г. г. кансэрвавых пэхаў пры новых мясакамбінатах, 36 рыбакансэрвавых берагавых і 23 плывучых заводаў, 36 садова-гародных кансэрвавых заводаў і 40 варачных і сушыльных пунктаў для садовіны і гародніны з давядзеньнем выпрацоўкі кансэрваў у 1933 годзе ня менш 2,4 мільярда банак з наступным разьмеркаваньнем іх па гадох і відах прадукцыі ў мільёнах банак:

	Мясн.	Рыбн.	Гародн.	Садов.	Тамат	Усяго
1932 г.	230	400	350	85	185	1.250
1933 г.	450	600	730	200	420	2.400

8. Разьвіцьцё мясакансэрвовай вытворчасьці павінна быць пабудавана на:

а) поўнай загрузцы вытворчага апарату існуючых мясакансэрвавых заводаў.

б) скарыстаньні рыбных „гародных кансэрвавых заводаў у сэзон зацішша работ для вырабу мясных кансэрваў;

в) будаўніцтве ў складзе новых будуючыхся ў жывёлагадоўчых раёнах мясакамбінатаў спэцыяльных кансэрвавых цэхаў з агульнай вытворчай магутнасьцю ў дзьве зьмены ў 435 млн. банк (Сямілапацінскі, Самарскі, Пакроўскі і Орскі—па 90 млн. банак, Сібірскі, Сыр-дар'інскі і Верхнеудзінскі—па 25 млн. банак).

9. Разьвіцьцё рыбакансэрвавай вытворчасьці павінна быць згрупавана ў раёнах ,значная частка ўлову якіх ня можа быць вывезена ў спажываючыя цэнтры ў сьвежым ці мароженым выглядзе, а таксама ў раёны, дагэтуль недастаткова ахопленыя прамысловай пераапрацоўкай, дзе скарыстаньне рыбных сыравіных рэсурсаў знаходзіцца яшчэ па якасна нізкім узроўні. У адпаведнасьці з гэтым будаўніцтва новых спэцыяльных рыбакансэрвавых прадпрыемстваў у асноўных павінна быць накіравана на асваеньне раёнаў Касьпійскага вадазбору, Ціхаакіянскага вадазбору, Паўночнага і Арала-Балхаскага раёнаў. У гэтых мэтах зацьвердзіць будаўніцтва 59 берагавых і плывучых кансэрвавых заводаў з агульнай вытворчай магутнасьцю ў дзьве зьмены ў 327 млн. банак з наступным разьмеркаваньнем іх па басэйнах:

а) у Касьпійскім вадазборы—8 берагавых рыбакансэрвавых заводаў (у Гур'еве, Мангішлаке, Жылой Касе, Донгізе, у раёне Белінскага банку, Ла гане Джыліше, Гасан-Куле) і 16 плывучых заводаў:

б) у Ціхаакіянскім вадазборы—14 кансэрвавых заводаў на Амуры, Прымор'е і Камчатцы і 7 плывучых краба кансэрвавых заводаў;

в) у Паўночным краі—5 заводаў, на Аральскім моры—3, на возеры Балхаш—2, на Усходняй Сібіры і Якуціі—4 заводы.

10. У раёнах, з якіх частка рыбы можа быць дастаўлена ў цэнтры ў марожаным выглядзе, кансэрвавыя заводы павінны быць камбінаваны з халадзільнікамі для замарожваньня рыбы, цэхамі па вырабе рыбнага філе і спэцыяльнымі цэхамі па ўтылізацыі адыходаў рыбнай вытворчасьці.

11. Весьці будаўніцтва спэцыяльных садова-гародных кансэрвавых прадпрыемстваў з такім разьлікам, каб ахапіць садовінагародныя масывы раёнаў, адда лёных ад прамысловых цэнтраў. У 1932 і 1933 гадох пабудаваць 36 гарод на-садовіных кансэрвавых заводаў з агульнай вытворчай магутнасьцю каля 1.200 млн. банак, з іх 6—на Ніжняй Волзе, 2—на Сярэдняй Волзе, 7—на Украіне, 10—на Паўночным Каўказе, 3—у Закаўказьі.

12. У мэтах рацыяналізацыі і канцэнтрацыі вытворчасьці бляшанабанчнай тары разгарнуць будаўніцтва ў 1932 і 1933 г. г. пяці раённых бляшатарных заводаў для абслугоўваньня цягаценых да іх кансэрвавых заводаў.

IV.

13. Разгортваньне мясной і кансэрвавай прамысловасьці прад'яўляе адказныя патрабаваньні да савецкага машынабудаўніцтва. Небходна ў поўнай меры скарыстаць вопыт і дасягненьні перадавой замежнай тэхнікі ў справе арганізацыі ў СССР масавай вытворчасьці мясапрамысловага і кансэрвавага абсталяваньня найбольш дасканалага ўзору.

ЦК і СНК прапануюць ВСНГ СССР згрупаваць паказаную вытворчасьць у спэцыяльным усесаюзным аб'яднаньні па харчовым машынабудаўніцтве, з безадкладнай перадачай яму раду машынабудаўнічых заводаў і арганізацыяй у складзе гэтага аб'яднаньня (у месячны тэрмін) канструктарскага бюро па спэцыяльным мясакансэрвавым машынабудаўніцтва. Сьпіс перадаваных заводаў, а таксама плян іх спэцыялізацыі і пашырэньня прадставіць не пазьней 15 кастрычніка на зацьверджаньне СПА (Савет Працы і Абароны).

Пры зацьверджаньні праграмы мясапрамысловага і кансэрвавага машына будаўніцтва СПА прадугледзець, пачы наючы з канца 1932 г., поўнае задаволеньне мясакамбінатаў і кансэрвавых заводаў як спэцыяльным тэхналёгічным абсталяваньнем (канвэерныя сталы, скрэбмашыны, электрычныя пілы, экстракцыйныя і ўтылізацыйныя ўстаноўкі, аўтаклявы, закотачныя аўтаматы, рэзальныя, працярачныя і ачышчальныя агрэгаты і г. д.), так і агульнаназавадзкім абсталяваньнем (сілавыя ўстаноўкі, катлы, помпы, вэнтылятары і г. д.).

14. Для забясьпячэньня своечасовага пуску першай групы нанова будуючыхся мясакамбінатаў у Маскве, Ленінградзе, Сямілапацінску і Орску ЦК і СНК лічуць неабходным:

а) абавязаць ВСНГ СССР разгарнуць вытворчасьць абсталяваньня для іх з такім разьлікам, каб для Маскоўскага і Сямілапацінскага камбінатаў здаць усё абсталяваньне не пазьней другога кварталу, для Ленінградзкага і Орскага—не пазьней трэцяга кварталу 1932 г.

б) прапанаваць СНА пры зацьверджаньні пляну цёпла-электраснабжэньня забясьпечыць патрэбнасьць мясапрамысловых камбінатаў у электраэнэргіі і пары, прадугледзеўшы ў прыватнасьці своечасовае заканчэньне 1 цёплацэнтралі ў Маскве і раённай цёпла электрацэнтралі ў Сямілапацінску.

в) Ускласьці на маскоўскі і ленінградзкі саветы адказнасьць за своечасовую падачу на тэрыторыю нанова будуючыхся камбінатаў вады, прадстаўленьне жыльля для рабочых і правядзеньня каналізацыі.

15. У адпаведнасьці з агульным пляном будаўніцтва мясной індустрыі ЦК і СНК лічаць неабходным правядзеньне карэннай рэканструкцыі халадзільнай і хладатранспартнай гаспадаркі і прапануюць Савету Працы і Абароны ў месячны тэрмін разглядзець і зацьвердзіць:

а) праграму будаўніцтва халадзільнікаў (базісных, разьмеркавальных і пры магазынах, сталовых, фабрыках-кухнях), лёдавыробчых заводаў, заводаў па вырабу сухога лёду; плян будаўніцтва ізатэрмічных вагонаў, рэф рыжэратарных параходаў і спэцыяльных вагонаў па перавозцы жывёлы.

б) Плян забясьпячэньня мясной прамысловасьці спэцыяльным аўтамабільным паркам як для падвозу жывёлы да мясакамбінатаў, так і для развозкі гатовай прадукцыі па разьмеркавальнай сетцы.

16. Для забясьпячэньня бесьперабойнага снабжэньня кансэрвавай прамысловасьці тарай прызнаць неабходным побач з мерапрыемствамі па рацыянізацыі скарыстаньня белай бляхі (адна баковая палуда, зьніжэньне адыходаў бляхі ў вырабе банак, зьняцьце волавa з абрэзкаў бляхі, скарыстаньне старых банак і г. д.);

а) павялічыць выраб белай бляхі ў 1932 г. да 130 тыс. тон і ў 1933 г.—да 266 тыс. тон.

б) шырака ўжываць у кансэрвавай вытворчасьці цыклянную тару, выходзячы з разьліку выпуску ня менш 400 млн. банак кансэрваў у цыклянай тары ў 1932 г. і 800 млн. банак у 1933 г., для чаго ВСНГ СССР па пагоджаньні з Наркамснабам пабудаваць на працягу 1932 г. у раёнах размешчаньня прадпрыемстваў кансэрвавай прамысловасьці чатыры заводы па мэханізаваным вырабе цыклянай тары, а Саюзкансэрву пабудаваць самастойна рад заводаў па вырабе цыклянай тары.

V.

17. Вынікам нізкага тэхнічнага ўзроўню існуючых прадпрыемстваў мясной і кансэрвавай прамысловасьці і сэзонасьці гэтых вытворчасьцяй зьяўляецца надзвычайны недахват сярэдняга і кіруючага тэхнічнага пэрсаналу і спэцыяльных рабочых кадраў.

У мэтах забясьпячэньня мясной і кансэрвавай прамысловасьці адпаведнымі інжынэрна-тэхнічнымі і рабочымі кадрамі ЦК і СНК прызнаюць неабходным:

а) Даручыць Наркампрацы разам з адзьелам кадраў ЦК у месячны тэрмін падабраць з іншых галін гаспадаркі адпаведную колькасьць інжынэраў-прэктоўшчыкаў і тэхнікаў-чарцёжнікаў для спэцыяльнай праектнай канторы жывэраў-будаўнікоў і інжынэраў-мэ«Гіпрамяса» і патрэбную колькасьць інжанікаў для Мясахладбуду.

б) Наркамснабу забясьпечыць праз спэцыяльныя курсы падрыхтоўку для будуючыхся мясакамбінатаў і прадпрыемстваў кансэрвавай прамысловасьці кваліфікаваных рабочых і малодшага тэхнічнага пэрсаналу вядучых спэцыяльнасьцяй (закотчыкі, фаршыроўшчыкі, соусьнікі, абжаршчыцы, тлустаўкі, кішэчнікі і інш.), у тым ліку 1.500 чалавек кваліфікаваных рабочых для мясной прамысловасьці ў 1932 годзе і для кансэрвавай прамысловасьці 1.000 тэхнікаў, і 4.000 кваліфікаваных рабочых у 1933 годзе.

в) Пры будаўніцтве буйных і сярэдніх мясакамбінатаў і буйных кансэрвавых прадпрыемстваў аднаасобна весьці будаўніцтва школ ФЗУ, а пры Маскоўскім мясакамбінаце разгарнуць будаўніцтва вучэбнага камбінату (прадпрыемствы—ВТНУ) для падрыхтоўкі вышэйшага і сярэдняга тэхнічнага пэрсаналу.

VI.

18. ЦК і СНК асобна адзначаюць усю важнасьць задачы ўсямернага палепшаньня і поўнага скарыстаньня існуючых мясакамбінатаў, бэконных і каўбасных фабрык, боенскіх прадпрыемстваў і кансэрвавых заводаў. Уся справа мяснога набжэньня ў 1931 і 1932 г.г. поўнасьцю, у 1933 г. у значнай яшчэ ступені будзе і павінна абапірацца на работу існуючых прадпрыемстваў. Вытворчасьць рознага віду кансэрваў можа і павінна быць значна павялічана яшчэ ў 1931 і 1932 г. г. на існуючых кансэрвавых заводах, вытворчая магутнасьць якіх скарыстана пакуль у неда статковай ступені.

Выходзячы з гэтага, ЦК і СНК лічуць неабходным:

а) Правесьці ў 1931—1932 г. г. неабходную рэканструкцыю і пашырэньне паасобных цэхаў існуючых мясакамбінатаў сярэдняга тыпу (Омск, Петрапаўлаўск і г. д.) для зьнішчэньня дыспрапорцыі паміж асобымі цэхамі і павялічэньня вытворчай магутнасьці камбінатаў у цэлым.

б) Правесьці неабходныя рацыянальзатарскія мерапрыемствы і прыбудовы паасобных цэхаў да існуючых гарадзкіх бойняў для зьнішчэньня антысанітарнага стану ў іх і максымальнай утылізацыі адыходаў боенскай гаспадаркі для вырабу мясакостнай мукі, альбуміны і інш.

в) Пастаўіць пры ўсіх рыбакансэрвавых заводах утылізацыйныя ўстаноўкі для перапрацоўкі адыходаў рыбакансэрвавага вырабу ў рыбную муку і рыб'і тлушчы.

г) Бязумоўна зьнішчыць наглядаючыяся перабоі ў загрузцы існуючых прадпрыемстваў мясной і кансэрвавай прамысловасьці, правёўшы прымацаваньне да мясакамбінатаў, бэконных фабрык і бойняў поўных раёнаў загатоўкі жывёлы, да рыбакансэрвавых заводаў—прымацаваньне далучаных да іх раёнаў здабываньня рыбы. Для забясьпячэньня кансэрвавай прамысловасьці ўстойлівай сыравіннай базай абавязаць Саюзкансэрву і садовінага родныя кансэрвавыя заводы да заключэньня з блізкаляжачымі, далучанымі да заводаў калгасамі і саўгасамі дагаворамі на выраб і здачу адпаведнай колькасьці сартоў сыравінны, а таксама разгарнуць вакол кансэрвавых заводаў уласную гаспадарку, разьлічаную на пакрыцьцё 15-20 проц. усёй патрэбнасьці ўласнай сыравінай. Адначасова праверыць выкананьне пашэньняў сьнежаньскага пленуму ЦК аб замацаваньні за садова і пладова кансэрвавымі заводамі 25 кілёмэтравай сыравінай зоны.

д) максымальна палепшыць якасьць мясных прадуктаў, асабліва каўбасы і кансэрваў, устанавіўшы за адказнасьць Наркамснабу строгую браковку выпускаемых гатовых прадуктаў і кансэрвавых і каўбасных фабрык.

е) Для рашучай барацьбы з антысанітарным станам мясных кансэрвавых прадпрыемстваў стварыць пры Наркамснабе спэцыяльную санітарную інспэкцыю, даўшы права санітарным дактаром выдаваць для дырэктароў і кіраўнікоў чага пэрсаналу прадпрыемстваў абавязковыя распараджэньні па санітарыі і гігіене. Забясьпечыць рабочых, удзельнічаючых у вырабе мясных прадуктаў і кансэрваў, дастатковай колькасьцю спэцвопраткі і мылам.

ж) У мэтах замацаваньня сталых кваліфікаваных кадраў мясапрамысловых прадпрыемстваў і кансэрвавых заводаў ,для ўздыму прамысловасьці працы і барацьбы з цякучасьцю паглядзець сыстэму аплаты працы рабочым, выпучыўшы асобна і павялічыўшы аплату рабочых рашаючых прафэсій і забясьпечыўшы інжынэрна-тэхнічнаму пэрсаналу адпаведную аплату працы і надежныя ўмовы работы па кіраўніцтву вытворчасьцю.

***

ЦК і СНК лічаць, што карэннае палепшаньне ў снабжэньні працоўных мясам, рыбнымі прадуктамі і кансэрвамі магчыма толькі на аснове шырокага разгортваньня новага будаўніцтва мясных камбінатаў і кансэрвавых заводаў, рэканструкцыі і палепшаньня існуючых мясных і кансэрвавых прадпрыемстваў і рацыяналізатарскай арганізацыі іх скарыстаньня пры ўсямерным разгортваньні ў раёнах іх далучэньня да сацыялістычнай сыравінай базы—саўгасаў і калгасаў.

Надаючы асабліва гаспадарчае і палітычнае значэньне разьвіцьцю мясной і кансэрвавай прамысловасьці, ЦК і СНК заклікаюць усе партыйныя і савецкія арганізацыі, усіх работнікаў мясной і кансэрвавай прамысловасьці маблізаваць вакол задач, пастаўленых тэтым зваротам ЦК і СНК ,увагу і сілы савецкай і партыйнай грамадзкасьці і забясьпечыць поўнае выкананьне намечанай праграмы і хутчэйшую пабудову магутнай мясной і кансэрвавай індустрыі, якая абапіраецца на высока арганізаваную сацыялістычную сыравінную базу.

Старшыня савету народных камісараў Саюзу ССР **В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).**

Сакратар ЦК УсеКП(б) **І. СТАЛІН.**

Ліквідаваць на хаду ўсе недахопы

ў разгортваньні навучальнага году

У Шклоўскім раёне пастанова ЦК УсеКП б) не знайшла праламленьня ў практычнай рабоце

У Шклоўшчыне яшчэ не узяліся за ажыцьцяўленьне дырэктыў ЦК УсеКП(б)

Гістарычная пастанова ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе не зрабіла яшчэ адпаведнага ўплыву на работу партыйных, савецкіх і прафэсыянальных арганізацый Шклоўшчыны. Апошні час, праўда, каапэрацыйныя ўстановы сталі лепш забясьпечваць настаўніцтва, але і то ня ўсе. Былі факты яшчэ нядаўна, калі Загранскае сельспажыўтаварыства выдавала настаўнікам на поўную норму прадуктаў і прэмтавараў. Гарадзішчанскі сельсавет зацягваў зарплату настаўнікам да трох месяцаў і ня вылічваў яе да таго часу пакуль у гэту справу не ўмяшалася РСІ. Хвашчаўскі сельсавет за 5 месяцаў яшчэ ня выплаціў настаўніцы Агеевай зарплату за выкладаньне польскай мовы ў беларуска-польскай школе. Нявыплату зарплаты настаўніцы сельсавет матывуе тым, што па бюджэце на гэта не адпушчана сродкаў. Гэта пытаньне і зараз яшчэ ня ўрэгулявана.

З забясьпячэньнем настаўніцтва прамтаварамі справа абстаіць таксама дрэнна. Каапэрацыя яшчэ працягвае забясьпечваць настаўнікаў прамтаварамі толькі па камэрцыйных цэнах. Забясьпечаньне прамтаварамі яшчэ больш-менш здавальняюча пастаўлена толькі ў горадзе. Гэтае пытаньне патрабуе хутчэйшага ўрэгуляваньня як з боку райсаюзу, так і Белкаапсаюзу.

Самае галоўнае на што патрэбна зьвярнуць увагу, гэта паварот тварам да школьнае працы ўсіх мясцовых арганізацый. Як школа працуе, аб гэтым невядома ні сельсавету, ні партыйнай і камсамольскай ячэйцы, ні старшыні калгасу.

Калі даводзіцца праводзіць якую-небудзь працу кампанейскага характару, ці дапаматчы сельсавету ў правядзеньні яе, настаўнікаў часта скарыстоўваюць для гэтай работы, што адбіваецца на рабоце школы.

За такую „нагрузку" настаўнікаў вінаватых трэба прыцягваць да адказнасьці. Між тым, па гэтым і па іншых сельсаветах культмасавая праца, як па калгасах, так і па вёсках адсутнічае. Надышоў навучальны год. Перад настаўнікам і перад усімі арганізацыямі і грамадзкасьцю стаіць вялікая задача ахапіць дзяцей школьнага ўзросту школай, прыйсьці да суцэльнай пісьменнасьці. Гэтыя задачы магчыма выканаць, калі ў вырашэньні іх прыме ўдзел уся грамадзкасьць.

З удзелам шырокай грамадзкасьці пад кіраўніцтвам партыі мы выканаем пастанову аб усеагульным навучаньні, ліквідацыі няпісьменнасьці і палітэхнізацыі школы.

Г. Ш.

Зр ўшчыкаў усенавуча—да адказнасьці

Паводле дырэктыў ЦК КП(б)Б і СНК БССР Савецкая Беларусь павінна да 1-га мая стаць краінай суцэльнай пісьменнасьці. На дырэктывы партыі і ўраду Віцебскі гарсавет і ўся пралетарская грамадзкасьць высунулі сустрэчны плян,— да 14-й гадавіны Кастрычніка ператварыць Віцебск у горад суцэльнай пісьменнасьці. Сустрэчны плян пачаў з энтузіязмам ажыцьцяўляцца. У горадзе адчынілася шмат новых школ для дарослых, ФЗВ і Тэхнікумаў.

28-га жніўня гарсавет вынес пастанову аб увядзеньні ўсеагульнага абавязковага навучаньня за сямігодку па ўсім раёне. Лепшая частка асьветнікаў зразумела важнасьць і сур'ёзнасьць гэтага пытаньня і ўзялася ажыцьцяўляць пастановы партыі і ўраду. Але сярод асьветнікаў ёсьць і такія, якія ўпарта не жадаюць ажыцьцяўляць гэтыя гістарычныя пастановы. Напрыклад, настаўніца 1-й ФЗС **т. Арэх** адмовілася працаваць у сямігодцы з прычыны «хворасьці», але адначасова яна згодна працаваць у тэхнікуме, альбо на чыгунцы. Настаўніца 8-й ФЗС **тав. Раманава** таксама ня выходзіць на працу ў школу. Настаўніца **т. Зэліксон** адмовілася працаваць у яўрэйскай пачатковай школе таму, што ся павінна і магу працаваць у другім канцэнтры». **Далганава**—настаўніца 6-й сямігодкі адмовілася выходзіць на працу. Настаўніца **т. Будзька** была апошнія годы беспрацоўнай і, маючы добрую кваліфікацыю, адмаўляецца ісьці працаваць, чым зрывае працу ў 3-й пачатковай школе. Настаўніца **т. Абельская**, прызначаная ў 4-ю яўрэйскую пачатковую школу, таксама ня выходзіць на працу.

Гэтых таварышоў нельга інакш кваліфікаваць, як дэзэртыраў фронту ўсеагульнага навучаньня. Пралетарская грамадзкасьць павінна ганьбіць такіх асьветнікаў, прафарганізацыі праца

Да справаздачнай кампаніі саветаў

СЕНЬНЯ У МАСАВЫМ АГЛЯДЗЕ РАБОТЫ САВЕТАЎ

удзельнічаюць раён: Заслаўскі, сельсаветы: Клінецкі, Судзілаўскі і Красавіцкі

У масавы агляд яшчэ не ўключыліся гарадзкія саветы, сэкцыі і дэпутацкія групы

Шырока разгортваючы крытыку і самакрытыку, асабліва ў час справаздачнай кампаніі саветаў, ажывіць і ўзмацніць дзейнасьць сэкцый саветаў, дэпутацкіх груп, беднаты на падставе апошніх пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б (З пастановы ЦВК БССР)

Сельсаветы Заслаўшчыны павінны перабудаваць сваю работу

Ня раз ужо на старонках нашай газэты пісалася, што тыя сельсаветы, якія яшчэ не перабудавалі работы па новаму, ня могуць быць на справе ба раньбітамі за чоткае правядзеньне ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній. Усе такія сельсаветы ў час масавага агляду работы сельсаветаў перад надыходзячай справаздачнай кампаніяй павінны быць выяўлены і тых работнікаў, якія ня хочуць актыўна ўдзельнічаць у рабоце саветаў і ажыцьцяўляць новыя сацыялістычныя формы работы неабходна выкінуць са складу органаў дыктатуры пралетарыяту і замяніць лепшымі ўдарнікамі рабочымі і калгаснікамі.

Праводзячы масавы агляд работы саветаў трэба высунуць на суд грамадзкай думкі сельсаветы Заслаўшчыны. Зьвернемся за фактамі. У Шаршульскім сельсавеце былое кіраўніцтва пакінула надта дрэнную спадчыну. У гэтым сельсавеце ніякага націску на кулакоў ня было. Праваапартуністычная практыка ўкаранілася ва ўсіх галінах работы сельсавету, масавая работа зусім адсутнічала, ніводная з сэкцый сельсавету не працавала. Уся работа сельсавету праходзіла самацёкам.

Як кіраўніцтва, так і члены сельсавету ніводнага разу ня ставілі пытань не аб перабудове сваёй работы ў нраму павароту тварам да калгасаў. Як вынік такой пастаноўкі работы—калектывізацыя бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па с.-с. на 1 верасьня ледзь дасягнула 8 проц. Сельсавет з часу перавыбараў налажыў на насельніцтва штрафу за невыкананьне рознага віду загатовак у суме 6.609 руб., з гэтае сумы на долю кулакоў прыпадае 5591 руб. Спагната-ж з кулакоў толькі 40 проц., а з беднякоў і сераднякоў 95 проц. Старшыня сельсавету Дашчынскі з паасобнымі сваімі членамі зьўсёды на пленумах, канфэрэнцыях і сходах выступаў і «аўтарытэтна» заяўляў, што ў яго ў сельсавеце кулакоў няма. А між іншым працаваўшая там некаторы час брыгада ЦВК выявіла 11 кулацкіх гаспадарак і 88 заможных. Але-ж райвыканком кулацкія гаспадаркі выявіў і аблажыў у індывідуальным парадку, а заможным гаспадаркам даў цьвёрдыя заданьні па загатоўках. За злачыннае захоўваньне кулакоў райвыканком распусьціў прэзыдыум сельсавету і былога старшыню сельсавету Дашчынскага аддаў пад суд.

Аднак, у складзе сельсавету засталося шмат падкулачнікаў і шкурнікаў. Амаль па ўсіх вёсках утоены аб'екты абкладаньня. Члены сельсавету пра гэта добра ведаюць і сваіх памылак не выпраўляюць. Так, напрыклад, у в. Камкі ўтоена 60 га зямлі дзесяцю заможнымі гаспадаркамі.

У в. Слабада Таратута Антось, які атрымаў цьвёрдае заданьне хадзіў па хатах беднякоў і сераднякоў і гаварыў: «уступайце ў калгас, бо заўтра і вам дадуць цьвёрдае заданьне». Гэтым ён меў на ўвазе схавацца за плечы калгасу і сапраўды, у выніку яго работы ўся вёска з 30 двароў увайшла ў калгас і Таратута застаўся старшынёю калгасу. Члены сельсавету пра гэта добра ведалі, але ў адпаведныя органы пра гэту справу не даносілі.

Ня лепш абстаіць работа і ў Анусінскім сельсавеце. У гэтым сельсавеце наглядаецца «левы» заскок. Усё гэта ад таго, што сельсавет працаваў бяз мас, закрыта ў габінэце сельсавету. Каб ня быць галаслоўным прывядзем і тут факты. Гэты сельсавет нават дадумаўся да таго, што аштрафаваў далкам сялян двох вёсак (Крычкі і Чырвоны Сьцяг) за ўтоеньне зямлі ад аб'ектаў абкладаньня і па 50 руб. ад кожнае дойнае каровы за няздачу лішак малака. Пры налажэньні штрафу зусім ня прымалася пад увагу сацыяльнае становішча таго ці іншага селянина. Хоць гэтыя «лявацкія» загібы і выпраўленыя РВК, аднак, ёсьць яшчэ шмат іншых фактаў, якія яшчэ ня выкрыты, асабліва па давядзеньні цьвёрдых заданьняў да маламоцных серадняцкіх гаспадарак.

Члены сельсавету в. Рэўкуцэвічы абараняюць індывідуальна абложанага кулака Тарасевіча, яны ўвесь час клапоцяцца каб зьнясьць з яго індывідуальнае абкладаньне. Такіх фактаў па Заслаўшчыне ёсьць шмат, яны зьяўляюцца перашкодаю да пасьпяховага і поўнага ажыцьцяўленьня задач партыі і ўраду ў рэканструкцыйны пэрыяд і гэтым самым затрымліваюць сацыялістычнае будаўніцтва.

Брыгады па масаваму агляду работы саветаў павінны прыняць усе меры да поўнага выяўленьня такіх фактаў з тым, каб ачысьціць сельскія саветы ад усялякага шкоднага і няздольнага сваячасова ажыцьцяўляць на справе дырэктывы партыі і ўраду.

Вакол такіх фактаў трэба разгарнуць шырокую бальшавіцкую крытыку і самакрытыку на справаздачных сходах і на аснове яе адшукаць новыя каштоўныя прапановы выбаршчыкаў па перабудове работы саветаў.

Толькі масавай пастаноўкай работы і шырокім ужываньнем сацыялістычных форм работы можна дабіцца завяршэньня перабудовы работы саветаў.

Сельсаветы Заслаўшчыны пад кіраўніцтвам партыі гэта выканаюць.

Байкаш.

Адміністраваньне—замест работы з беднатою

Клінецкі сельсавет. Чэрвенскага раёну, які налічвае каля 600 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, на сёньняшні дзень калектывізаваны толькі на 5 проц., у той час як па БССР калектывізавана 48 проц. усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Такое становішча можна тлумачыць выключна адсутнасьцю шырока растлумачальнай масавай работы сярод бядняцка-серадняцкіх мас і наяўнасьцю абураючых перагібаў, якія дапушчае прэзыдыум Клінецкага сельсавету на чале са старшынёй яго тав. Раманчанка. Замест растлумачальнай работы і папулярызацыі пазыкі «3-га рашаючага», сельсавет адмініструе — даво дзіць цьвёрдае заданьне да кожнай бядняцка - серадняцкай гаспадаркі ў суме каля 100 руб. і потым спаганяе як падатак.

У вёсцы Аточная Слабада за невыкананьне заданьня па пазыцы ў серадняка Краснагіра Васіля ўзяты былі падушкі, у Баброўкі Язэпа выводзілася карова, з хлева. У сельсавеце практыкавалася абкладаньне сераднякоў падаткам у індывідуальным парадку пад прыкрыцьцём формулы: «у маім сельсавеце кулакі як грыбы растуць».

Старшыня с.-с. Раманчук мае і любім чыкаў, якім ён ідзе на сустрач. У вёсцы Аточная Слабада Верын Філіп і брат (краўцы) маюць 6,25 дз. зямлі, каб ухіліцца ад абкладаньня прыбыткаў, яны выпісваюць з гаспадаркі самога Веры на Філіпа, а жыць усяроўна працягваюць разам. Гэта зроблена таму, што Раманчык заўсёды ў гэтай гаспадарцы знаходзіць прыемны прытулак. Намесьнік старшыні сельсавету Ладуцька Мікола ў мінулым, заматаўшы шмат грамадзкіх грошай, хуліганіў па вёсках. Зараз калі праводзіць сходы за мест растлумачэньня запалохвае «мы вам дамо месца». Калі ў вёсцы Аточная Слабада і быў арганізаваны па ініцыятыве беднякоў і сераднякоў калгас у гэтым годзе, дык у выніку такой дзейнасьці сельсавету калгас разваліўся. Патрэбна тэрміновае ўмяшаньне пракуратуры, каб рашуча пакараць перагібшчыкаў, а раёным арганізацыям больш зьвярнуць увагі на забесьпячэньня кіруючымі работнікамі Клінецкага сельсавету, пастаноўкі растлумачальна-масавай работы, бо насельніцтва гэтага сельсавету ў асаблівасьці вёсак Аточная Слабада, Іванічы і Вогма ўсе часы як у мінулым так і зараз пераважна беднота.

Д.

Латыскі нацсавет ня кіруе калгасамі

Нацыянальныя калгасы «Бязбожнік» і «Трудавік» з прычыны бязьдзейнасьці сельсавету маюць рад буйных прарываў як па ўборцы ўраджаю, так і па загатоўках. Так, калгасам «Бязбожнік» засеяна азімі замест 140 га, толькі 117; аўсу і ячменю да 21-IX ня скончана 22 га. Ярына з поля ня зьвезена. Ворыва на зяб не пачата. Пляну па сіласаваньні няма.

Ня лепш абстаіць справа і ў калгасе «Трудавік». Да гэтага часу не засеяна 9 га жыта; 15 га ярыны з поля ня ўбрана. Па ўсім сельсавеце не сабрана каля 100 га аўсу і ячменю.

Кулацкія і заможныя гаспадаркі пляну ня выконваюць, да ўзорваньня на зяб не прыступілі.

Кіраўніцтва з боку раённых арганізацый нацсаветам недастатковае.

Нацыянальным калгасам «Бязбожнік» і «Трудавік» трэба падцягнуцца, а сельсавету лепш кіраваць апошнімі.

В. Сянькевіч.

Каралёўскі і Асінаўскі сельсаветы адст юць

У Каралёўскім і Асінаўскім сельсаветах калгасы не справіліся з задачамі ў галіне выкананьня гаспадарча-палітычных кампаній.

На 21-IX па Каралёўскім сельсавеце ў калгасах ня скошана сенажаці 22 га, канюшыны—7га, вікі—13 га. Ня выкананы таксама і плян па сіласаваньні. І гэта ў той час, калі, як зараз выявілася, што кармоў для жывёлы ня хопіць.

Ня лепш абстаіць справа з зябам і сяўбою азімых. Сяўба азімых выканана ня больш як на 60-65 проц., па зяблена толькі 8 га (паводле пляну 1718 га). У Асінаўскім сельсавеце справа ня лапшая. Па 2-х калгасах ня скошана 15 га сенажаці; авёс можна на полі прарастае. Лён на 30 проц. не абмалочаны.

З мабілізацыяй сродкаў у гэтых двух сельсаветах таксама прарывы. Такое становішча выклікана тым, што кулацкія і заможныя элемэнты вёскі залезьлі ў калгасы і там вядуць сваю ганебную падрыўную работу. Замест барацьбы з імі зазначаныя сельсаветы злачынна бязьдзейнічалі, калгасам не кіравалі, далі магчымасьць кулацкім элемэнтам расьпіразацца і весьці падрыўную работу. Сакратар Асінаўскага сельсавету на працягу двух больш год засядае ў сельсавеце, п'янствуе з кулацтвам, перавялічвае зьвесткі па пасеву бульбы і лёну, работу ў сельсавеце сабатуе.

Прэзыдыум Лёзьнянскага РВК як сьлед ацаніў працу гэтых сельсаветаў.

Старшыня Каралёўскага сельсавету і сакратар Асінаўскага сельсавету з работы зьняты і аддаены пад суд.

Са шкоднікамі сацбудаўніцтва інакш рабіць нельга.

В. Сянькевіч.

Судзілаўскі і Красавіцкі сельсаветы на правільным шляху

На тэрыторыі Судзілаўскага сельсавету арганізавана 10 калгасаў, з іх 1 у 1929 г. і 9 у 1931 г. Такім чынам калектывізацыяй ахоплена 412 гаспадарак з 4.171 г. зямлі, што складае 96,4 проц. у адносінах бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па сельсавеце і 89 проц. у адносінах усяе плошчы сельсавету.

Якім-жа чынам сельсавет ажыцьцяўляе кіраўніцтва калгасаў? Перш за ўсё ўсе члены сельсавету зьяўляюцца калгаснікамі. Пляны работы калгасаў цесна ўвязаны з плянам работы сельсавету. Пры сельсавеце арганізавана сельска-гаспадарчая вытворчая нарада, якая паставіла сабе мэту падрыхтоўкі мерапрыемстваў па гаспадарчым замацаваньні калгасаў. Гэтая с.-г. вытворчая нарада сельсавету складаецца з членаў сельсавету, старшынь калгасаў, брыгадзіраў у калгасах па асобных галінах працы, жывёлаводаў, паляводаў, і г. д. Адначасова ў склад гэтае нарады ўваходзіць настаўніцтва, дэлегаткі і заўжды на паседжаньні с.-г. нарады пры сельсавеце прысутнічае шмат калгаснікаў. Сталы склад нарады 97 асоб.

Асноўныя пытаньні, якімі прасякнута ўся работа с.-г. нарады—гэта пытаньне гаспадарчага замацаваньня калгасаў, а менавіта: разьмеркаваньні ўраджаю, разьвіцьцё сацыялістычнай жывёлагадоўлі, арганізацыя працы і г. д. Усе гэтыя пытаньні папярэдня распрацоўваюцца на с.-г. вытворчай нарадзе сельсавету, з практычнымі мерапрыемствамі — перапосяцца на прэзыдыум сельсавету і пасьля на шырокае абгаварэньне калгаснікаў для правядзеньня іх у жыцьцё.

У выніку такой пастаноўкі работы, у калгасах дамагліся правільнай арганізацыі працы, пераходу на зьдельшчыну, ліквідацыі абязьлічкі і самацёку ва ўсіх галінах работы. Дзякуючы гэтаму нясупынна ідзе прылёў сялянства ў існуючыя калгасы.

Дзякуючы правільнаму кіраўніцтву калгасамі з боку сельсавету, які ў асноўных галінах сваёй работы абапіраецца на калгаснікаў, мы маем наступныя лічбы выкананьня важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній па Судзілаўскім сельсавеце: асеньняя сяўба выканана на плошчы ў 1.456 га з агульнага пляну 1597 га, уборка ўраджаю прайшла ў строга вызначаны тэрмін, хлебазагатоўкі з заданьня ў 639 цэнтн. па становішчы на 20-га верасьня, выкананы на 1,929 цэнтн.

Дзякуючы правільнай арганізацыі працы ў калгасах па сельсавеце маюцца лішнія рабочыя рукі, што дало магчымасьць выканаць заданьне па вярбоўцы рабочых на Данбас на ўсе 100 проц.

Адыходніцтва ў сельсавеце ня ідзе самацёкам, а шляхам заключэньня дагавораў калгасаў з гаспадарчымі арганізацыямі. Калгасы сельсавету далі прамысловасьці 117 рабочых. Арганізацыйна-масавая работа з беднатой пастаўлена здавальняюча. Беднота арганізавана ў групу беднаты пры сельсавеце і ўсе пытаньні работы савету абгаворваюцца на групе беднаты.

У апошні час сельсавет заслухоўваў даклады праўленьняў калгасаў аб іх рабоце. Трэба адзначыць, што ўсе даклады калгасаў справаджаліся папярэднім абсьледваньнем стану работы брыгадамі.

***

Другі сельсавет, які здавальняюча справіўся з задачамі кіраўніцтва калгасным рухам—гэта Красавіцкі сельсавет, які, да часу ўзмацненьня яго працаздольнымі таварышамі, быў на апошнім месцы. Увесь сельсавет займае плошчу ў 5.204 га з насельніцтвам у 622 чал. На тэрыторыі сельсавету ёсьць 2 калгасы, якія аб'яднаюць у сябе 350 гаспадарак, што складае 56,9 проц. у адносінах агульнай колькасьці гаспадарак.

Формы кіраўніцтва калгасамі ў гэтым сельсавеце такія-ж як і ў Судзілаўскім. Да гэтага часу Красавіцкі сельсавет па ўсіх галінах работы быў на апошнім месцы ў раёне. Зараз ён—адзін з перадавых. Гэта можна бачыць з таго, што Красавіцкі сельсавет добра выконвае ўсе гаспадарча-палітычныя кампаніі за апошні час. Дзякуючы правільнаму кіраўніцтву сельсавету, пры дапамозе упаўнаважаных райвыканкому, сельсавет пасьпяхова выконвае асеньнія сельска-гаспадарчыя работы. Націск на кулака і пастаноўка арганізацыйна-масавай работы з беднатой, уцягненьне беднаты і калгаснікаў у практычныя работы сельсавету праз сэкцыі дало магчымасьць дабіцца перамог—Вопыт работ яшчэ раз падкрэсьлівае, што, пры правільнай пастаноўцы работы і ўмелай расстаноўцы сіл,—сельсаветы здолеюць выканаць задачы, ускладзеныя на іх партыяй і ўрадам.

Старшыня райвыканкому

М. Лоцманаў.

На Крычаўшчыне кулак ч пашане

КРЫЧАЎ, (Белта). Гадавы плян збожжазагатовак на 10 верасьня выканан на 12,2 проц., а па пляну на гэты тэрмін трэба было выканаць на 25 проц. Такое рэзкае недавыкананьне пляну тлумачыцца галоўным чынам адсутнасьцю дастатковай масавай работы вакол загатовак і недастатковым націскам на кулацка-заможныя гаспадаркі.

Ёсьць сельсаветы (Крычаўскага раёну і інш.), па якіх ад аднаасобнікаў і не паступіла яшчэ ніводнага кілё збожжа. Міхаеўскі і Балускі сельсаветы прымірэнча адносяцца да кулацка-заможных гаспадарак, якія яшчэ зусім нічога не здалі дзяржаве.

Трэба рашуча ўдарыць па адносінах да кулака, павесьці масавую работу з калгаснікамі і бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі за датэрміновае выкананьне пляну збожжазагатовак.

Узмацнім апарат цэнтральных і раённых газэт за лік рабселькораў-ударнікаў

Пашырым штодзенныя газэты ў саўгасах і калгасах. Нанясем руйнуючы ўдар па ня выконваючых дырэктыў 2-га ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў аб перабудове нізавога друку

Калгасная газэта і абарона

Нашы посьпехі на фронце індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі вызываюць шалёную ненавісьць супроць нас з боку імпэрыялістаў.

Вось чаму мы ні на 1 хвіліну не павінны забываць аб умацаваньні абароны краіны. Шырокі размах калектывізацыі складае добрыя ўмовы для разгортваньня вайсковай работы ў калгасах і саўгасах.

Гэтыя умовы павінны быць як найлепш і шырэй выкарыстаны. Калгасныя саўгасныя газэты павінны быць адным з рычагоў арганізацыі вайсковай справы ў сацыялістычным сэктары вёскі. Селькоры ударнікі калгасна-саўгасных газэт павінны ня толькі асьвятляць у газэтах вайсковую працу, але і прымаць па ўдарнаму актыўны ўдзел у арганізацыі гэтай працы.

Як-жа арганізаваць і як весьці вайсковую справу ў калгаснай газэце?

У склад рэдкалегіі патрэбна ўвесьці аднаго двух селькораў, якія цікавяцца вайсковай справай. У пляне працы рэдкалегіі патрэбна абавязкова прадугледзець задачы газэты ў галіне вайсковай прапаганды. Рэдкалегія павінна даручыць аднаму з сваіх членаў вясьці вайсковы аддзел, адвясьці для яго ў газэце належнае месца. Партыйныя органы пры заслухоўваньні справаздачы аб рабоце газэт павінны зьвярнуць увагу на пастаноўку ў газэтах вайсковай прапаганды.

Мы, ужо сказалі, што ў галіне практычнай работы па ўмацаваньні абароны калгасная газэта павінна ня толькі асьвятляць тое, што робіцца, але і быць актыўным арганізатарам у вайсковай справе. Яна павінна праводзіць спэцыяльныя нарады па Асаовіяхімаўскай міжзборавай і інш. рабоце, зьмяшчаць на сваіх старонках вайсковыя задачы, арганізаваць спаборніцтва на лепшага стралка, вайсковы гурток і г. д.

Калгасы і саўгасы маюць вялікія магчымасьці для арганізацыі вайсковых паходаў, тактычных выхадаў у поле і інш.

Такія пытаньні, як міжзбораная работа, абучэньне ўневайсковікоў, прызыў у Чырвоную армію і сустрэча адпускнікоў чырвонаармейцаў таксама павінна знаходзіць у калгасных і саўгасных газэтах шырокае асьвятленьне. Гэткія ў агульных рысах задачы калгасных і саўгасных газэт у галіне вайсковай прапаганды. Разумеецца, што гэтыя задачы ня вычарпаны цалкам. Практычная работа можа высунуць цэлы рад новых пытаньняў.

Задача кожнай газэты заключаецца ў тым, каб у свой час падхапіць тое ці іншае пытаньне, здолець прыцягнуць грамадзкую ўвагу да яго і давесьці да канца.

І. Паўлоўскі.

Штодзёнкі калгасаў „Энэргія", „Леніна" і „Рабселькор" Ельшчыны паказваюць прыклад добрай работы

Па ініцыятыве газэты «Рабселькор» 16-га верасьня быў скліканы зьлёт селькораў Сянюкоўскага сельсавету. На зьлёце селькоры заявілі, што яны пакажуць узоры добрай работы ў калгасах і саўгасах, разгорнуць масавую работу сярод калгаснікаў і рабочых будуць змагацца за поўнае выкананьне пляну па жывёлагадоўлі.

Селькоры ў калгасах «Энэргія», «Леніна» і «Рабселькор» арганізавалі выпуск штодзёнак, якія з першых дзён уступілі ў бой за ажыцьцяўленьне пастановы аб сацыялістычнай жывёлагадоўлі, аб сканчэньні да вызначанага тэрміну сіласаваньня і будаўніцтва, аб правільным наладжваньні кармленьня жывёлы, аб уборцы пасеву і аб культурным абслугоўваньні калгаснікаў. Калгаснікі сталі актыўнымі барацьбітамі ў справе выкананьня гэтых задач. Штодзенка асьвятляюць у газэце працы брыгад і паасобных калгаснікаў. Некаторыя штодзёнкі дабіліся датэрміновага сканчэньня асеньняй сяўбы, уборкі ўраджаю, маладзьбы і сіласаваньня.

Штодзёнкі калгасаў «Энэргія», «Леніна» і «Рабселькор» паказваюць прыклад добрай работы. Штодзёнкі гэтых калгасаў раёну павінны раўняцца па іх рабоце.

Брыгада Н. Невядомскі. Р. Сімковіч.

Там, дзе няма партыкіраўніцтва

На лесапільным заводзе «Чырвоны Бор», Хойніцкага раёну, насьценгазэта за апошнія тры месяцы зусім ня выходзіла. Да гэтага часу на заводзе не прапрацавана пастанова і тэзісы 2-га Ўсебеларускага зьезду рабселькораў. Парт'ячэйка заводу ніякіх захадаў ня прымае ў разгортваньні нізавога друку.

М. Жук.

Калі-ж выйдзе газэта?

У маі месяцы РК КП(б)Б Сіроцінчыны зьбіраўся выпусьціць шматтыражку. Была абрана рэдкалегія, але і да гэтага часу ў Сіроцінскім раёне няма ніводнага нумару раённай насьценгазэты. Пытаемся калі-ж выйдзе газэта?

Сюжэтаў.

Няма каапэрацыйнага абслугоўваньня

КРУПКІ. Прызыў у разгары, а Белкаапсаюз да гэтага часу не адпусьціў ніводнага граму прадуктаў для абслугоўваньня прызыўнікаў.

Адпаведным органам неабходна праверыць ці няма ў снабжэнчых установах тых, хто наўмысьля зрывае такую важную палітычную кампанію.

М. С.

Пастанова бюро Менгаркому КП(б)Б ад 26-IX—31 г.

аб выкананьні пастановы ЦК пра газэтныя кадры

Задачы, пастаўленыя перад цэнтральным друкам патрабуюць сыстэматычнага паляпшэньня складу яго працаўнікоў за лік лепшых рабкораў-ударнікаў. Менская Гарадзкая арганізацыя КП(б)Б, як адна з перадавых арганізацый, павінна прыняць самы актыўны ўдзел у выкананьні пастановы ЦК КП(б)Б ад 28-V—31 г. аб газэтных кадрах.

Выходзячы з гэтага, бюро Менгаркому КП(б)Б пастанаўляе:

Вылучыць з ліку Менскіх рабкораў-ударнікаў 20 чалавек на сталую адказную рэдакцыйную работу ў рэдакцыях цэнтральных газэт з якіх 8 чалавек для рэдакцыі «Зьвязда».

Прапанаваць Культпропу Гаркому разам з Аддз. Кадраў ГК разьвярстаць тэрмінова гэту колькасьць паміж буйнымі вытворчымі парткалектывамі. Парткалектывам правесьці вызначаныя кандыдатуры праз рабочыя сходы.

2. Даручыць Культпропу Гаркому і парткалектыву рэдакцый арганізаваць для падрыхтоўкі гэтых вылучэнцаў 6-ці тыднёвыя курсы.

3. Прапанаваць парт. калектыву рэдакцый цэнтральных газэт прыняць актыўны ўдзел у вызначэньні кандыдатур і іх разьмяркаваньні.

4. Прапанаваць ячэйкам КП(б)Б БАН, Усебеларускіх прафкурсаў і п.-к. ВСНГБ прасачыць за работай і скарыстоўваньнем у рэдакцыях прымацаваных асьпірантаў, курсантаў і гаспадарнікаў.

5. Парткому Камвузу прасачыць за сваячасовым вызначэньнем студэнтаў на работу ў рэдакцыях у парадку практыкі.

6. Надаючы вялікае значэньне рабоце ў рэдакцыях газэт у парадку сацсумяшчэньня лепшых рабкораў-ударнікаў, а таксама спэцыялістаў, гаспадарчых і прафсаюзных работнікаў, лічыць работу ў рэдакцыях у парадку сацсумяшчэньня аснаўной грамадзкай нагрузкай. Фр. Гарпрафсавету даць паказаньне фабзаўмясцкомам.

7. Культпропу Гаркому КП(б)Б праз тры тыдні далажыць бюро аб выкананьні гэтай пастановы.

8. Пастанову апублікаваць у друку.

Пашырыць вопыт штодзёнак

На пабудове дзяржбібліятэкі (Менск) арганізаван выпуск насьценгазэты што дзённі. «За работу па ўовамy». Праз насьценгазэту рабочыя ўдарнікі змагаюцца за выкананьне будаўнічага пляну ў тэрмін. Па ініцыятыве рабкораў-ударнікаў заключаны ўмовы сацспаборніцтва паміж брыгадамі. Пры насьценгазэце арганізавана бюро рэагаваньня на заметкі. Праз насьценгазэту рабочымі ўносіцца рад практычных прапаноў. Зараз шмат рабочых уцягнуты ў работу насьценгазэты і лёзунг — «кожны ўдарнік рабкор—кожны рабкор ударнік» ператвараецца ў жыцьцё.

Далейшая задача не паслабіць працы штодзённі, а замацаваць і перанесьці гэты вопыт на другія пабудовы.

В. Ж.

У новых умовах спажыўкаапэрацыя павінна працаваць па-новаму

У Менску, Воршы, Жлобіне і Барысаве спажыўкаапэрацыя яшчэ не перабудавалася. Белкаапсаюз і Лесбел зрываюць забесьпячэньне рабочых чырвонасьцяжнага „Бальшавіка"

Бясплянавасьць у забесьпячэньні рабочых „Бальшавіка"

ЗРК гарбарні «Бальшавік» арганізаван 1-га ліпеня г. г.

Гэты час дзейнасьці каапэратыву заключаўся ў ператварэньні магазыну ЦРК у заводзкі каапэратыў, які-б змог поўнасьцю абслужыць і забясьпечыць ударны завод усімі неабходнымі спажывецкімі, прамысловымі, галянтарэйнымі і іншымі таварамі і прадуктамі.

Да дню арганізацыі каапэратыву па гарбарні было 1.335 чал. пайнікаў.

За ліпень і жнівень да ЗРК прымацавана 131 новых рабочых, але пагэтых рабочых у суме 1.460 руб. знаходзяцца ў другіх рабкопах і не пераводзяцца па месцу іх прымацаваньня, ня гледзячы на неаднаразовыя запатрабаваньні праўленьня ЗРК. На лепш абстаіць справа з мэтавымі ўзносамі. За тры месяцы трэба сабраць 800 руб. Заводакраўніцтва запэўнівае, што за подпісам рабочых пералічана дзьве тысячы руб., на справе-ж вылічана толькі 400 руб. і ў агульным сабрана 532 рублі.

Галоўным тормазам у пашырэньні і разьвіцьці работы завадзкога каапэратыву зьяўляецца неплянавае забесьпячэньне яго з боку Белкаапсаюзу.

Заключаныя дагаворы з Белкаапсаюзам не адпавядаюць патрабаваньням чырвонаштандарнага «Бальшавіка».

Да прыкладу: прамгрупа Белкаапсаюзу вызначыла прамтавараў для ЗРК на шэсьць месяцаў на 12 тыс. руб. Гэта ні ў якім разе не задавальняе запатрабаваньняў рабочых. Праўленьне ЗРК вышуквае і стварае неплянавыя закупкі, якія і зьяўляюцца галоўным зваротам каапэратыву.

Такое самае становішча і ў забесьпячэньні рабочых садовіной і гароднінай. Дагавор заключан з Менрайкаапсаюзам на дастаўку 72 тон садовіны, але гэты дагавор нявыкананы нават і на адзін процант.

Па рознарадцы Менрайкаапсаюзу, лаяльнымі пастаўшчыкамі заводу павінны былі быць саўгас «Чырвоны Спэцыяліст», які павінен даць 41 тону садавіны, «Чырвоны Партызан»—29 тон і Трасьцянскі прыгарадны сельсавет—адну тону. Ні адзін з паказаных лаяльных дагавораў ня выкананы.

Такое самае становішча ў забесьпячэньні бульбаю. З 602 тоны плянавых рознарадак Менрайкаапсаюзу, не атры мана ніводнага кілёграму.

Надзвычайна «добрым» аказаўся Белкаапсаюз у забесьпячэньні рабочых рыбай. Яе доўгі час ня бачылі сьцены заводзкага каапэратыву. Але нечакана ў ліпені месяцы рыбнае навадненьне награнула хмараю ў 3.209 кілёграм. Зразумела, што рыба пачала псавацца і каб пазбавіцца «гнілое рыбасьпекі», ЗРК пачало прадаваць яе бяз нормы усім жадаўшым.

Прамфінплян ЗРК за тры месяцы ў 200 тысяч руб. ужо перавыкананы на 36 проц.

Трэба адзначыць, што з-за адсутнасьці сталага кіраўніцтва з боку Белкаапсаюзу і адсутнасьці неабходных кадраў дырэктыва партыі аб пераводзе на гаспадарчы разьлік сталоўкі і аб арганізацыі самастойнай харчовай сэкцыі— яшчэ невыканана.

Белкаапсаюз замест жывой сувязі і кіраўніцтва ЗРК, загружае апошняга розными папяровымі адносінамі. Ня лепш стаіць справа з забесьпячэньнем рабочых «Бальшавіка» дровамі.

З Лесбелам і Асінавіцкім леспрамгасам яшчэ ў ліпені месяцы заключаны дагаворы на дастаўку ЗРК дроў. ЗРК арганізаваў на сродкі рабочых транспарт з пяці коняй, вылучыў са сваіх сродкаў на чатыры тысячы прамтавараў для прэм'яваньня ўдарнікаў Асінавіцкага Леспрамгасу. Але і тут, як заяўляе старшыня ЗРК, вылучэнец, тав. Ліпкер «нас надулі».

За квартал, Леспрамгас павінен даць заводу 110 вагонаў дроў, з якіх за ліпень і жнівень павінна было быць да стаўлена 40 вагонаў. На справе-ж Леспрамгас даў толькі 11 вагонаў.

Пытаньне балючае, яно патрабуе найхутчэйшага вырашэньня.

Яшчэ адна бюракратычная блытаніна, як гаворыць той-жа тав. Ліпкер, гэта справа з авансамі, якія знаходзяцца на руках у рабочых, у выглядзе папярэдніх заказаў (талёнаў) на прамысловыя тавары, што выдаваў МЦРК паўгода таму назад. Іх налічваецца на 25 тысяч руб. і ляжаць яны мёртвым капіталам у кішэнях рабочых.

Гэтае пытаньне таксама трэба неадкладна вырашыць.

Прэзыдыум Белкаапсаюзу і Лесбел павінны зараз-жа рэагаваць на гэтыя факты.

Контус.

Неадкладна палепшыць харчваньне барысаўскіх рабочых

Перабудова работы Барысаўскага ЦРК праходзіць нездавальняюча. Асабліва слабы ўдзел у гэтай справе прымаюць камсамольская і прафсаюзная арганізацыі.

Бюро Барысаўскага райкому КП(б)Б было вымушана канстатаваць невыкананьне дырэктыў ЦК і СНК па пытаньні перабудовы каапэрацыі і адзначыла значныя прарывы ў галіне забесьпячэньня рабочых Барысаўшчыны.

Асабліва дрэнным зьяўляецца становішча грамадзкага харчаваньня ў Барысаве. Усяго маецца 12 сталовых, з іх 9 закрытых. Якасьць абедаў усё яшчэ застаецца нездавальняючай. Мясныя абеды бываюць толькі 10 дзён у месяц. Тлушчаў амаль няма. Рыба часта бывае ня сьвежая. У сталоўках ствараюцца вялікія чаргі, наглядаецца грубыя адносіны абслугоўваючага пэрсаналу да абедаючых і г. д. Да недахопаў трэба аднесьці і аднастайнасьць абедаў. Акрамя таго ў сталоўках выглядаецца разнабой у цэнах. Так, напрыклад, у сталоўцы № 1 порцыя парасяціны каштуе 2 руб., а ў сталоўцы № 2—2 р. 50 к., шклянка кавы ў адной сталоўцы каштуе 20 кап., а ў другой 15 к. Рабочы кантроль у сталоўках амаль што адсутнічае. Чамусьці да гэтага часу яшчэ не адчынена ніводная камсамольская сталоўка.

Бараноўскі.

Аршанскае ТСТ не забясьпечыла

чыгуначнікаў добраякасным харчаваньнем

АРШАНСКАЕ ТСТ (Транспартнае спажыўтаварыства) мае 11 тысяч пайнікаў. ТСТ адчыніла да гэтага часу ўсяго 14 крам. З прычыны недахвату крам у час выдачы пайкоў стварацца вялікія чаргі. Праўленьне ТСТ ніякай барацьбы з чаргамі не вядзе.

Адным з слабых бакоў у рабоце ТСТ зьяўляецца грамадзкае харчаваньне.

Нядаўна рабочымі брыгадамі быў праведзены агляд становішча грамадзкага харчаваньня Аршанскага ТСТ. Пры аглядзе выявілася наступнае: амаль ва ўсіх сталоўках рабочым ня выдана спэцвопратка, адсутнічаюць леднікі, кухонны інвэнтар у дрэнным становішчы, адсутнічае аптэчка, памяшканьне кухань цеснае, працыцыпліна нізкая і г. д. У 11-ай сталоўцы наглядаюцца выпадкі выдачы недабраякасных абедаў.

Вучоту зьдзельшчыны па сталоўках няма, што дрэнна адбіваецца на прадукцыйнасьці працы.

Па некаторых сталоўках наглядаецца перавыдатак прадуктаў. Пабудова фабрыкі-кухні зараз, чамусьці, спынена.

Адчуваецца недахват кадраў па грамадзкім харчаваньні. Кнігі скаргаў у некаторых сталоўках адсутнічаюць.

Неабходна зараз-жа мабілізаваць масы вакол пастановы ЦК УсеКП(б), разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж сталоўкамі і паасобнымі работнікамі сталовак, забясьпечыць сталоўкі патрэбнымі кадрамі. Толькі пры ажыцьцяўленьні гэтых умоў можна дасягнуць 100-процантнага выкананьня пастановы ЦК УсеКП(б) аб палепшаньні грамадзкага харчаваньня.

Б-кі.

Перабудова работы Жлобінскага гарспажыўтаварыства „не датычыцца"

Перабудова каапэрацыі згодна рашэньняў ЦК, СНК і Цэнтрасаюзу прайшла міма кіраўніцтва Жлобінскага гарспажыўтаварыства. Першым недахопам зьяўляецца тое, што праўленьне Жлібінскага гарспажыўтаварыства не перайшло яшчэ на ўласны ліміт. Грамадзкае харчаваньне і прыгарадныя гаспадаркі не перайшлі на самастойны баланс. Бухгальтэрыя адстае на паўтара месяца.

Гандльфінплян па крамах пачалі праводзіць толькі з сярэдніх чыслаў жніўня месяца і да работнікаў прылаўка яшчэ не давялі. Аб пераводзе на зьдзельную аплату працы работнікаў прылаўка пакуль што і ня думаюць. У горадзе Жлобіне няма ніводнага магазіну ці ларка, які гандляваў-бы садавінай і гароднінай. Садавіна і гародніна ў Жлобінскім гарспажыўтаварыстве настолькі дэфіцытны тавар, што іх няма нават у сталоўках гарспажыўтаварыства. Праўленьне не займалася пытаньнем аб самастойных загатоўках садав

За бесьперабойнае фінансаваньне
сапыялістычнага будаўніцтва

Ва ўсеўзбраеньні сустрэць

апошні квартал трэцяга рашаючага. Па-бальшавіцку змагацца за выкананьне фінпляну

Ліквідаваць запазычанасьць па фінпляне III-га кварталу. Калгасы БССР павінны ўключыцца ў конкурс Наркамфіну на лепшы калгас

Правесьці конкурс на лепшы калгас
Выканаць фінплян 4-га кварталу

Фінплян БССР за 3-ці квартал г. г. выкананы толькі на 71 проц. Пазыка «3-ці рашаючы» па вёсцы рэалізавана на 39,9 проц., па страхавых плацяжох на 60,9 проц., па акцыях Трактарацэнтру на 36,4 проц., па абавязацельствах сельгаснабжэньня на 30,9 проц. і па ўзносах калгасаў у фонд доўгатэрміновага крэдытаваньня на 65,2 проц.

Цэлы рад раёнаў яшчэ не ўявіў сабе важнасьці прыцягненьня сродкаў насельніцтва і не здолеў арганізаваць працы на выкананьне фінпляну. Напрыклад Лельчыцкі р. выконаў фінплян на 47 пр., Мсьціслаўск—43 пр., Дубровенскі—45,6 пр., Касьцюковіцкі—49 проц., Талачынскі—52,8 пр., Чэрыкаўскі—51 проц. Гэта ў той час як некаторыя раёны цалкам выканалі і перавыканалі плянавыя заданьні: Сіроцінскі 111,5 проц., Аршанскі—95 проц. Ва ўмовах шырокага росту калектывізацыі ўся арганізацыйная работа па мабілізацыі сродкаў насельніцтва можа пасьпяхова праводзіцца толькі пры апоры на калгасную грамадзкасьць і на сытэму калгасаў.

Лепшыя калгасы і калгасьнікі, паказаўшыя ўзорныя прыклады па выкананьні фінпляну будуць прэміраваны ў разьмеры ад 100 руб. да 5.000 руб. Калгасы БССР павінны паказаць лепшыя прыклады выкананьня фінпляну і павесьці за сабой ўвесь аднаасобны сэктар вёскі.

Белы.

За рэалізацыю фінпляну змагаюцца слаба

КРЫЧАЎ, 25-IX. (БЕЛТА). Выкананьне фінансавага пляну за трэці квартал па Крычаўскім раёне праходзіць нездавальняюча. Па становішчы на 20-е верасьня квартальны плян выкананы на 62,6 проц. Толькі па некаторых аб'ектах фінпляны выкананы і перавыкананы. Па сел.-гасп. падатку квартальны плян выкананы на 144,5 проц., па падаходных падатках—на 142,8 проц., прамыславатку—158,3 проц., жылзборы—140,1 проц. Па спагнаньні страхоўкі плян выканан на 48,8 проц., па акцыях Трактарацэнтру—78,7 проц. Зусім нездавальняюча праходзіць мабілізацыя сродкаў па дні спажывецкай кааперацыі, якая выканала свой плян на 36 проц. Яшчэ горш абстаіць справа з павялічэньнем укладчыкаў ашчадных касы. Квартальны плян па ўкладах выканан на 7,3 проц.

Збор сродкаў па падпісцы на пазыку «3-га рашаючага» выкананы на 65,7 проц. Шэраг арганізацый яшчэ не афармілі падпіску.

Такое становішча вынікла ў рэзультаце адсутнасьці масавай работы. Партыйныя ячэйкі і прафсаюзы зусім мала займаюцца гэтым пытаньнем, штодзённай работы няма.

Выкананьне фінпляну пад пагрозай зрыву

Дуброўна. 26-IX. (Белта). На 20-е верасьня фінплян на трэці квартал выкананы толькі на 44 проц. Асабліва гаебна адстаюць Нова-Тухінскі, Целяўіцкі, Сваташыцкі і Чарнаручанскі сельсаветы, якія фінплян выканалі менш чым на 25 проц.

Фінансавы прарыў зьяўляецца вынікам таго, што сельсаветы, кааперацыя і гаспадарчыя арганізацыі праяўляюць апартуністычную бязьдзейнасьць і самацёк у гэтай важнейшай справе. Афармленьне падпіскі на пазыку «3-ці рашаючы» выкананa толькі на 30 проц. Уцягненьне вольных сродкаў насельніцтва праз ашчадкасу праходзіць вельмі марудна. Плян на трэці квартал па гэтай галіне выкананы ўсяго на 15 проц.

Таксама бязьдзейнічаюць МТС і РКС у справе рэалізацыі абавязацельстваў Трактарацэнтру. Плян рэалізацыі выкананы толькі на 13,3 проц.

Акцыі Сельгаснабжэньня і Трактар цэнтру—рэалізуюцца слаба

(Мсьціслаўль)

Рэалізацыя абавязацельстваў «Сельгаснабжэньня і акцый Трактарацэнтру ў раёне праходзіць вельмі дрэнна. Аб гэтым сьведчаць наступныя лічбы. Па раёне трэба было распаўсюдзіць абавязацельстваў «Сельгаснабжэньня» на 12.860 р., а распаўсюджана ўсяго на 2.250 руб. Амаль такое-ж становішча і ў рэалізацыі акцый Трактарацэнтру. У гэтай галіне плян выкананы на 28 проц.

МТС, РКС і райашчадкасы ў гэтым пытаньні праяўляюць поўную бязьдзейнасьць. Трэба было-б Мсьціслаўскім раённым арганізацыям ведаць, што рэалізацыя акцый зьяўляецца неадымнай часткай фінансавага пляну.

Палонскі.

Сродкі з самабкладаньня на культурныя ўстановы

Агульны сход грамадзян Крупскага местачковага савету аднагалосна прыняў рэзалюцыю аб прыняцьці на ўсе 100 проц. пляну самаабкладаньня. Такія самыя рэзалюцыі прыняты па ўсім раёне, за выключэньне вёскі Карэлёва. Ігрушаўскага сельсавету, якая прыняла 75 проц. У рэзалюцыях сялянскіх сходаў адзначаецца, што дзякуючы самаабкладаньню за мінулыя гады па раёне было адчынена шмат ліпунктаў, мэдпунктаў і значна ўзмоцнены пажарныя дружыны. У гэтым годзе сродкі ад самаабкладаньня вырашана скарыстаць такім чынам: 60 проц. на культасьветныя ўстановы і 40 проц. на пажарную ахову.

Селькор «С. Б.» Раманоўскі.

Зводка выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў насельніцтва за III-ці квартал

Перадавыя раёны

(Даныя на 20-IX—31 г.)

Раёны	План за квартал (у тыс. р.)	Выкананa (у тыс. р.)	% выкананьня
Сіроцінскі	515,2	574,6	111,5
Аршанскі	1454,8	1381,0	94 9
Гомель	2837,4	2461,0	86,7
Менск	3618,7	3022,7	83,5
Любаньскі	340,9	280,3	82,2
Тураўскі	256 7	210 9	82 2

Адстаючыя раёны

(даныя на 20-IX—31 г.)

Раёны	Плян за квартал (у тыс. руб.)	Выкананa	Процант выкананьня
Бешанковіцкі	662,5	269,6	40,7
Мсьціслаўскі	631,2	272,1	43,1
Краснапольскі	516,7	230,8	44,7
Плешчаніцкі	315,2	143,6	45,6
Лельчыцкі	346,5	163,3	47.1

Сярэдні процант выкананьня па БССР—71.

МОПР БССР на дапамогу ў рэалізацыі пазыкі „3-ці рашаючы"

ЦК МОПР БССР узяў на сябе абавязак дапамагчы партыі і ўраду ў рэалізацыі пазыкі «3-ці рашаючы» сярод аднаасобнікаў, дзе асабліва нязвычайна слаба рэалізавана пазыка. ЦК МОПР'у ўзяў на сябе кантрольную лічбу 3.800.000 руб., для чаго мабілізаваў увесь свой актыў. У 52 раёны пасланы брыгадзіры ЦК у дапамогу МОПР-арганізацыям па рэалізацыі пазыкі. На 25 верасьня, па вестках 20 раёнаў, РК МОПР накіравалі 348 упаўнаважаных для распаўсюджваньня пазыкі сярод аднаасобнікаў па сельсаветах. Ужо рэалізавана за наяўны разьлік на 2.600 рублёў пазыкі сялянам аднаасобнікам.

Праўда, трэба адзначыць, што ня ўсе яшчэ Райкомы МОПР'у ўключыліся ў гэту важнейшую для МОПР'у справу. Большая частка районных арганізацый недапушчальна бязьдзейнічае. Нават і ня думаюць узяцца за дапамогу ў рэалізацыі пазыкі. Брыгадзіры ЦК МОПР, якія выехалі ў раёны, паведамляюць абураючыя факты. Старшыня Барысаўскага РК МОПР т. Жардэцкі, ён-жа кіраўнік аддзяленьня Дзяржбанку, замест таго, каб мабілізаваць нават некаторых з сваіх працаўнікоў банку, нічога ня робіць і бюрократычна адносіцца да гэтай справы. Ён спасылаецца на цяжкасьці і аб'ектыўныя прычыны. Старшыня Стара-Дароскага РК МОПР'у ня пусьціў да сябе брыгадзіра ЦК, гаворачы пры гэтым, што яму няма часу займацца рэалізацыяй пазыкі, а РК КП(б)Б адаслаў брыгадзіра ў РК МОПР, з свайго боку ніякай дапамогі не аказаўшы брыгадзіру. Старшыня Касьцюковіцкага РК МОПР т. Адаменка, ён-жа загадчык фінчасткі РВК, які павінен быў быць застрэльшчыкам у гэтай справе, гаворыць брыгадзіру ЦК—«нашто нам пазыка, у нас і так хапае работы, няхай абяруць новы РК МОПР'у і няхай ён займецца рэалізацыяй пазыкі». Тут мы маем у адным твары фінработнікаў і МОПР-кіраўнікоў, якія ігнаруюць справу распаўсюджваньня пазыкі, наплевацельскі адносяцца да сваіх непасрэдных абавязкаў, апартуністычна недаацэньваюць ролі МОПРу па ўдзеле ў сацыялістычным будаўніцтве і ў дапамозе партыі і ўраду па рэалізацыі пазыкі «3-ці рашаючы».

Яшчэ больш абураючыя факты падаюць брыгадзіры ЦК МОПР'у аб злачынных адносінах да сваіх абавязкаў райашчадкас, райфінаддзелаў, якія адмаўляюцца нават дапамагчы ў тэхнічнай працы па складаньні кантрольных лічбаў для сельскіх ячэек. Райашчадкасы Стара-Дароская, Любаньская, Барысаўская, Мсьціслаўская катэгарычна адмаўляюцца ад усякай дапамогі РК МОПР'у ў рэалізацыі пазыкі. Спасылаюцца на тое, што яны не атрымалі ніякіх дырэктыў ад Наркамфіну.

Характэрна тое, што НКФ БССР, Галоўнае Упраўленьне Ашчадкасамі і Дзяржбанк, Цэнтральная Камісія садзейнічаньня Дзяржкрэдыту, якія павінны былі падхапіць ініцыятыву ЦК МОПР'у і ўсякімі мерамі дапамагчы ў апэрацыйным кіраўніцтве ходам рэалізацыі пазыкі, стаяць у баку і нічым не дапамагаюць. НКФ абмежаваўся, толькі дачай дырэктывы, якую на мясцох райашчадкасы ня выконваюць. Цэнтральная Камісія Садзейнічаньня Дзяржкрэдыту на гэтых днёх, зьмяшчаючы адозву да ўсіх банкаўскіх і фінработнікаў аб мабілізацыі сябе на рэалізацыю пазыкі і мабілізацыю сродкаў, ніводным словам не спамянула аб садзейнічаньні МОПР'у ў выкананьні ўзятых на сябе абавязкаў. Ні Цэнтральная Камісія Садзейнічаньня, ні НКФ, ні Дзяржбанк ня цікавяцца як праходзіць кампанія рэалізацыі пазыкі сіламі мопраўскага актыву. Такія адносіны з боку зацікаўленых органаў зьяўляюцца недапушчальнымі. Без актыўнай дапамогі ўсіх работнікаў фінансавых органаў, райашчадкас і банкаўскіх устаноў ЦК МОПР ня выканае ўзятыя на сябе абавязкі.

Цэнтральны Камітэт МОПР'у БССР на сваім пасяджаньні ад 26 верасьня заслухаў інфармацыі з месц Магілеўскага, Мазырскага, Лепельскага, Аршанскага і Лельчыцкага РК МОПР'у а таксама аб ходзе рэалізацыі пазыкі па БССР, канстатаваў нязвычайна слаба разгорнутую работу на мясцох у гэтай галіне з боку Райкомаў МОПР'у і пастанавіў для больш хутчэйшай і поўнай рэалізацыі ўсяго заданьня—абвясьціць ударны 2-х тыднёвік з 25 верасьня па 10 кастрычніка, мабілізуючы на гэту работу ўвесь актыў.

ЦК МОПР'у адзначае пасыўныя адносіны работнікаў ашчадкас, банкаў і фінорганаў у правядзеньні работы па распаўсюджваньні пазыкі, аб чым даводзіць да ведама Наркамфіну СССР і БССР.

Абавязаць усіх брыгадзіраў ЦК затрымацца ў раёнах да поўнай рэалізацыі пазыкі па кантрольных заданьнях. Лепшых брыгадзіраў, якія выканаюць да 10 кастрычніка на 100 проц. заданьне прадставіць для прэміраваньня ў ЦК МОПР СССР.

Паставіць на від і абвясьціць у друку грамадзкае ганьбаваньне Барысаўскаму, Магілеўскаму, Лепельскаму, Мазырскаму і Лельчыцкаму райкомам МОПР'у за поўнае бязьдзейнічаньне па рэалізацыі пазыкі на 26 верасьня.

Выступленьне сакратара Лельчыцкага РК МОПР'у т. Гольдмана з заявай аб нерэальнасьці і немагчымасьці выкананьня заданьня па рэалізацыі пазыкі пры поўнай адсутнасьці ўсякай работы ў гэтай галіне, асудзіць як праяўленьне апартунізму ў мопраўскай рабоце, аб чым давесьці да ведама Лельчыцкага РК КП(б)Б і надрукаваць у газэце.

Выклікаць на сацыялістычнае спаборніцтва ЦК МОПР Украіны на хутчэйшае выкананьне 100 проц. заданьня па пазыцы.

Пры максымальнай і ўдарнай рабоце ўсіх МОПР-арганізацый, а таксама актыўнай і сапраўднай дапамозе ўсіх партыйных, камсамольскіх і савецкіх арганізацый, ЦК МОПР'у БССР выканае ўзятыя на сябе абавязкі, бо ўсе дадзеныя гавораць за тое, што на 3.800.000 рублёў можна рэалізаваць пазыку «3-ці рашаючы год пяцігодкі», што рэальныя магчымасьці ёсьць, бо аднаасобны сэктар нязвычайна адстае (усяго 8 проц. выкананьня па заданьні Наркамфіну).

ЦК МОПР'у БССР, узяўшы на сябе абавязак па рэалізацыі пазыкі на 3.800.000 рублёў, адказвае гэтым самым на зьверствы польскага фашызму, выказвае сваю салідарнасьць з палітзьняволенымі Польшчы, якія гэраічна змагаюцца з польскім фашызмам супроць турэмнага рэжыму катаваньняў, голаду, расстрэлаў і пажыцьцёвай катаргі. Гэтым самым ЦК МОПР дапамагае ўзмацненьню абароназдольнасьці Савецкай краіны, якая нясе сваім існаваньнем вызвалень не працоўным, прыгнечаным народам і палітзьняволеным усяго сьвету.

Цудзін.

ШАХМАТЫ І ШАШКІ

№ 12 (227)

Пад рэдакцыяй А. А. Касьперскага

Задача № 12.

Л. Лошынскі і Е. Умноў (Ростаў-Дон)

„30 дня й", II прыз.



Бел: Кр h6, Фе5, Лd4, Сс3, Сg6 п h2(6).
Чорн: Кр h4, Фс8, Ла3, Лb5, Сb8, Сg4, Кd8, Кg2, п п а4, с6, с7, е7. f7, h3 (14).
мат у 2 хады.

Задача № 13.

М. М. Баруліна (Масква)

З кампазытарскага матчу матч, Масква—Растоў, IV прыз.

Бел: Кр с5, Фа4, Лb2, Сf1, Сh6, Кe4, Кg2, пп а3, h4, b6, d3 (11)
Чорн: Кр d1, Фа4, Лb3, Сс2, Ка1, Кh1, пп: b7, е5, h7 (8) мат у 2 хады.

Міжнародны конкурс складаньня 2-хгадовых шахматных задач часопісу „Чырвоная Беларусь".

У нумары трыццатым абвешчаны конкурс складаньня задач, тэрміны прысылкі да 1 сьнежня 1931 г.

Мэта конкурсу

1) 100 проц. ахоп усіх савецкіх праблемістаў.

2) Прыцягненьне лепшых замежных праблемістаў.

Лёзунг конкурсу

Усе шахматныя кампазітары СССР — актыўныя ўдзельнікі грамадзкай шахматна-шашачнай працы.

Умовы конкурсу

1. У конкурсе ўдзельнічаюць усе арыгінальныя 2-хгадоўкі на простыя маты.

2. Конкурс закрыты (гэта значыць, што задачы дасылаюцца пад дэвізамі з прозьвішчам і адрасам аўтара ў асобным канвэрце).

3. Кожны праблемі́ст можа даслаць неабмежаваны лік задач.

4. За лепшыя задачы вызначана шэсьць прызоў, акрамя гэтага вызначана 4 спэцыяльных прызы і 2 ганаровых водзывы.

1. За лепшую задачу праблемісту БССР ня меншаму адліча на конкурсах.

2. За лепшую задачу проблемісту СССР ня меншаму адліча на конкурсах.

3. За лепшае правядзеньне тэмы „няпрыметных перакрыцьцяў" (прыклад м гэтай тэмы зьяўляецца задача № 12 гэтага аддзелу). 1. Сg6-h5 пагражае 2. Лd4:g4.Асноўныя варыянты. 1...Кg2 е3 1... Кg2-f4; 1... f7-f5 сапр ўлы засноўны на „няпрыкметных перакрыцьцях", якія становяцца в дзвочным толькі пасьля матуючага ходу.

4. За лепшы ёлёк (прыклад задачы № 13 гэтага аддзелу) 1. Фа4-d7! Да пачатковага ходу на ўсе ходы чорных маюцца гатовыя маты, а е белыя ня маюць пачатковага ходу, што прымушае іх замяніць гатовыя маты на новыя. Д п ршага ходу на 1... Лb3:d3 быў-бы мат Лb2-d1×. Пасьля першага ходу 1. Сf1-с2×

5. Задачы можна пасылаць да 1-га сьнежня 1931 г. па адрасу: Менск, Савецкая, 59 „Чырвоная Беларусь" на конкурс.

6. Фонд конкурсу 150 руб.

Вялікі шашачны сэанс Менск

31-га ліпеня на пабудове дому ўраду майстэр і гордон даў сэанс адначасовых игры ў шашкі супроць 55 ігракоў. Быў 1-кі+49—4—2. Зашкаў ешчасьць рабочых вялікам. Нажаль за адсутнія часу пра амаль што спынена дзякуючы рабачкому, як пера каджае игры.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

ЦК КП(б)Б паведамляе, што ў г. Віцебску 5-X і 6-X 1931 г. будзе працаваць выезная ПТ ЦКК КП(б)Б пад старшынствам члена ЦК ЦКК тав. Блаштэйна па разгляду апэляцый. На ПТ павінны зьявіцца т.т.

На 5-X 1931 г. 1) Зарэцкі В. В., 2) Краўло Ф. Э., 3) Сучкоў І. М., 4) Бесарабскі Ф. Л., 5) Міхайлаў І. Н:, 6) Раўчэнка З. Я., 7) Цітоў Т. В:, 8) Панцялееў Ц. Ф., 9) Кірнічоў С. Т., 10) Герыч І. В., 11) Трэцьцякоў С. П:, 12) Савіцкі К. Ю., 13) Шаплыко С. К:, 14) Харытановіч К. З., 15) Брыкаў Л. К, 16) Бязьлюдаў Ул. М., 17) Левін С. М., 18) Ахраменка Ф. А:, 19) Мядзьведзеў І. М., 20) Саўліч Б. І., (Віцебскі раён).

На 6-X 1931 г. 1) Жыглінскі Е. С., 2) Бэргер К. Ш., 3) Кажэмякін І. П. (Віцебскі раён), 4) Анішчанка П. Р.; 5) Шавека К. П., 6) Дзятлоўскі Д. П. (б. Багуш. р:), 7) Старавойтаў Еўд., 8) Парфінчук М. Л., 9) Шурынак Я. В., 10) Старавойтаў П. С. (Высачанскі р.), 11) Гутковіч Я. Я., 12) Балтушкін П. С., 13) Гудзян Я. І., 14) Сачыўка (нарсуд)—(Бешанковіцкі р.), 15) Карчагін І. Н., 16) Ефрэменка П. М., 17) Захарэнка П. І., (Сураскі раён), 18) Пальвінскі Ул. І. (Сіроцінскі раён).

На пасяджаньне ПТ павінны зьявіцца сакратары гар. ячэек, на вучоце якіх лічацца выкліканыя таварышы.

Праезд за свой кошт.

Усім гаркомам і райкомам КП(б)Б

Прапануецца не пазьней 5-га Кастрычніка 1931 г. даслаць у ЦК КП(б)Б статыстыкі аб росьце партыі у 3-м квартале і становішчы парт-арганізацыі на 1-X—31 г. па ф. ф. № 2, 2-а, 3-а і 6.

Нам. Заг. Арг. Інстр. Аддзелам ЦК КП(б)Б Гурэвіч.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР-КІНО-ЦЫРК

Кіно-тэатр Культура	Новы мастацкі фільм па раману Фадзеева „Разгром". Пач. а 7 гадз. Каса з 5 гадз
Кіно Пралетары	Арыгінальная камэдыя Бунт бабушак. Зьвыш праграмы хроніка № 31. Працуе з 12 гадз. дня.
Кіно Пралетары	Толькі 3 дні мастацкі фільм Банда бацькі Кныша. Зьверх праграмы хрон. саюзкіно № 47
„Чырвоная Зорка"	Гукавы фільм ПУЦЕЦКА У ЖЫЦЬЦЕ. Пачат. а 7 г., 8 45 і 10 30. Каса ад 5 г

ТРАНСПАРТНЫ ЛЯСНЫ ТРЭСТ

„БЕЛТРАНЛЕС",

згодна пастановы СНК СССР ад 1-VIII-31 г. і распараджэньня па ЦУС'у і ВОЛТ'у ад 16-VIII-г. г.,

ЛІКВІДУЕЦЦА

Усе прадпрыемствы Белтранлесу на ходу з усім пасывам і актывам перадаюцца наступным правапрыймальнікам:

1. Лясному Аддзелу МББ чыг. (Москва, Сретенский б-6).
2. Лясному Аддзелу Заходн. чыгун. (Калуга).
3. Лесбелу (Менск).
4. Заплесу (Смаленск)

Усе абавязацельствы Белтранлесу, а таксама і правы яго пераходзяць указаным установам у частках, маючых сувязь з прадпрыемствамі, якія ім перадаюцца.

Для афармленьня ліквідацыі Белтранлесу ў памяшканьні б. Белтранлесу (Менск, чыг. будынак у раёне Таварнай станцыі) працуе з 12-га верасьня г. г. Ліквідацыйная Камісія якая будзе прымаць да 10-га лістапада г. г. заявы па пратэнзіях па б. Белтранлесу

Дом Асьветы—сёньня 1-X а 6-й гадзіне ўвечары

АДЧЫНЯЕЦЦА

УНЕЧАРГОВЫ ПАШЫРАНЫ ПЛЕНУМ

Цэнтральнага Праўленьня Саюзу Белпрацасьветы.

АБВЕСТКА ДНЯ:

1) Вынікі VI унечарговага пленуму ЦК Працасьветы (дакл. ЦК Саюзу).
2) Даклады ЦП Саюзу і НК Асьветы аб практычных мерапрыемствах па рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе.
3) Аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі і падрыхтоўцы да зьезду.

Фракцыя Пленуму за гадзіну да адчыненьня Пленуму ў памяшканьні Дому Асьветы.

На пленум павінны абавязкова зьявіцца сябры і кандыдаты Пленуму і старшыні Горсайпраўленьняў Саюзу, а таксама старшыні Менскіх ГК, МК і Нарфкомаў.

Запрашаецца прафактыў г. Менску і Менскія асьветнікі-ударнікі.

Кірспраў ЦП РЫЗВАНОВІЧ.

ПРЫ ДУКОРСКАЙ ШКМ

З 5-X Г. Г. АДЧЫНЯЮЦЦА ПЭДКУРСЫ

Прымаюцца асобы, маючыя адукацыю за курс 7-кі і пераросткі з 7-й групы

Прынятыя ў большасьці забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй

Заявы накіроўваць па адрасу: Дукора, Пухавіцкага раёну,

ПЭДКУРСЫ

З 10 кастрычніка 1931 году, 18 участак

—„БЕЛСЕЛЬБУДУ"—

АДЧЫНЯЕ 2-х МЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ

па падрыхтоўцы цесьляроў (плотнікаў)

Курсантам выплачваецца па 2 рублі ў дзень за правадзімую работу з забясьпечаньнем кватэраю

На курсы прымаюцца калгасьнікі з прадстаўленьнем даведак ад праўленьня калгасу, рабочыя занятыя на работах у саўгасах, аднаасобнікі, батракі і беднякі з сялян.

Заяву падаваць у кантору 18 будучастку: Бабруйск, рог Лекерта і Урыцкага № 1 і прарабам наступных саўгасаў: Свісьлач, Старыя-Дарогі, Харомцы Завалочыцы, Веснава, Несята, Побалава, Забалаціце, Дурычы, Бацэвічы, Дойнічава, Молатава, Хальч і Эрштэр-Май.

КАНТОРА 18 БУДВУЧАСТКУ „БЕЛСЕЛЬБУДУ"

УВАГА

Скора выходзіць з друку першы нумар ілюстраванай навукова-тэхнічнай часопісі ВСНГБ і ЦСПСБ

„ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ"

Часопісь „ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ" разьлічана па шырокія колы каманднага складу прамысловасьці, піонерыя-комсамольскага і прафэсыйнага актыву, кваліф каваных рабочых-вынаходзіцаў, ударнікаў

Часопісь „ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ" ставіць перад сабой задачу ўнядрэньня тэхнікі і сацыялістычнай арганізацыі працы на строга навуковай падставе ў прамысловасьці БССР.

Часопісь „ШЛЯХ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ" мае аддзелы: 1) Агульны, 2) Арганізацыя вытворчасьці; 3) Дасягненьні навукі і тэхнікі ў СССР і за мяжой, 4) Абмен вопытам, 5) Кадры і рабсіла, 6) На мясцох, 7) Трыбуна, 8) Сяброўскі лыжак, 9) Адказы і консультацыя.

Падпісная плата: на год—3 р., на 6 м-цаў—1 р. 60 к., на 3 м-цы—85 к. Кошт паасобнага нумару—40 кап.

Адрас рэдакцыі Менск, Пляц Волі № 1-1, ВСНГБ, 3-й паверх пакой № 6. Тэлефон № 214-28

За выхадам нумару пачцеш у газетах.

Падпіска прымаецца толькі праз пошту і паштовыя агенцтвы

ПРЭЗЫДЫУМ БЕЛКААППРАМСАЮЗУ

паведамляе, што для непасрэдных разьлікаў пастаўшчыкоў і пакупнікаў з арганізаванымі, на падставе пастановы СНК БССР ад 30-га чэрвеня г. г. галінавымі гаспадарча-разьліковымі аб'яднаньнямі, БСПК

адчынены ва Усебеларускай Канторы Дзяржбанку ў Менску

кантакарэнтныя рахункі гэтых аб'яднаньняў за наступнымі №№

1. БЕЛКААППРАМБУДМАТАР'ЯЛ— Беларускае аб'яднаньне па вырабу і здабычы будаўнічых матар'ялаў прамысловай кааперацыі.
К.-к. у Дзяржбанку № 70-1280
2. БЕЛКААППРАМТОРФ. — Беларускае тарфяное аб'яднаньне прамысловай кааперацыі.
К.-к. у банку № 70-1282.
3. БЕЛКААППРАМЛЕСДРЭЎ.—Беларускае дрэваапрацоўчае і лесазагатоўчае аб'яднаньне прамысловай кааперацыі.
К.-к. № 70-1278
4. БЕЛКААППРАМХІМЛЕС. — Беларускае лесахімічнае і хімічнае аб'яднаньне прамысловай кааперацыі.
К.-к. № 70-1276.
5. БЕЛКААППРАМТЭКСТЫЛЬ. — Беларускае тэкстыльна-швэйна-трыкатажнае аб'яднаньне прамысловай кааперацыі.
К. к. № 70-1284.
6. БЕЛКААППРАМСКУР. — Беларускае скурна-абутковае аб'яднаньне прамысловай кааперацыі.
К.-к. № 70-1290.
7. БЕЛКААППРАММЭТАЛЬ. — Беларускае мэталяапрацоўчае аб'яднаньне прамысловай кааперацыі.
К.-к. № 70 1286
8. БЕЛКААППРАМХАРЧ. — Беларускае харча-смакавае аб'яднаньне прамысловай кааперацыі.
К.-к № 70-1274.
9. БЕЛКААППРАМУЦІЛЬТРАНС. — Беларускае утыльна-транспортнае і розных промыслаў аб'яднаньне прамысловай кааперацыі.
К.-к. № 70-1288.

Адрас усіх аб'яднаньняў: г. Менск, Інтэрнацыянальная, 9.

З адчыненьнем указаных кантакарэнтаў Белкааппрамсаюз ніякіх разьлікаў за памянёныя аб'яднаньні не вытварае.

Менскі Дзярж. Гідратэхнікум

даводзіць да ведама

усіх студэнтаў як новага набору, так і старэйшых курсаў, што пачатак заняткаў у тэхнікуме

АДКЛАДЗЕН.

Аб часе яўкі на заняткі і куды зьявіцца будзе паведамлена праз друк

Усе выдаткі, зробленыя студэнтамі на пераезды да часу іх вызаву, тэхнікум не аплачвае.

Нам. Дырэктара Гідратэхнікуму Лучянскі.

ЗГУБЛЕНЫ:

Камсамольскі білет Чэрняк Г. А:, выд. Мсьціслаўскім РК КСМ, квітанц. 1071-п.

Мэтрычная даведка Радкевіча В., выд. Бярэзінскай раймілiцыяй, квіт. 1072-п.

Дзьве пэнсіённыя кніжкі Аляксеява М. П. і Арловай З. П., выд: Жлобінскай страхкасай, квіт: 1073-п

Вайсковая кніжка і конская картка Жылюка М. І., квіт. 1074-п.

Вайсковая кніжка Проніна Ф. І., выд. Ельскім ваенкаматам, квіт. 1075-п

Асабовае пасьведчаньне Проніна, квіт. 1076-п.

Камсамольскі білет за № 121631 Дзячко М. Ф., выд. Мазырскім АК КСМ, квіт. 1079-п.

Пашпарт за № 19579 Шугаева А. І., выд. 1084-п.

Пашпарт нарадж. 1912 г., Папчэнкі Т. З., квіт: 1109-п:

Партбілет за № 1101399 Іванова М. М., выд. Мсьціслаўскім Саюзам Саўгандлдслуж., квіт. 1080-п.

Пасьведчаньне аб сканчэньні сямігодкі Несьцяровіча М. С., кв. 1082-п.

Бальнічны лісток за № 0516594-3582 Клімкевіча А. Н., Аршанскай чыг. бальніцай, квіт. 1083-п.

Конская вучотная картка Шабалтаса С. С., выд. 1085-п:

Вайсковы білет Концавай Н. В., выд. Горацкім ваенкаматам, квіт. 1107-п.

Конская кніжка Горшынаў В. Ф., выд. Дрыбінскім РВК, квіт. 1107-п

Асабовае пасьведчаньне за № 94 Гонемелеў М. М., выд. Пайлоўскім сельсаветам, квіт. 1107-п.

Асабовае пасьведчаньне Моненка С. І., выд. Чурылоўскім сельсаветам кв. 1107-п.

Членская кніжка Моненка С. І., выд. Дрыбінскім Саюзам Горнарабочых, квіт. 1107-п.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара 7-69, сакратара—4-78, сэктараў —6-15. Выдавецтва—2-44., выпускаючага 12-65 два зв.
падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—6 р., 1 год—12 руб.

Галоўлітбел № 598. Друкарня імя тав. СТАЛІНА.